З ЧЫМ ІДУЦЬ НА ПРЫЁМ У САВЕТ РЭСПУБЛІКІ

МС

ГЭТЫЯ КАРЫСНЫЯ... ШКОДНЫЯ БАКТЭРЫІ

13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

31 СТУДЗЕНЯ 2024 г.
СЕРАДА
№ 21 (30155)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ЦЫТАТА ДНЯ

Таццяна ВАСІЛЮЧАК, начальнік галоўнага ўпраўлення будаўніцтва і жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва:

«Яшчэ ў 2019 годзе кіраўніком дзяржавы пастаўлена задача па накіраванні шматдзетных сем'яў на будаўніцтва жылля на працягу аднаго года з дня пастаноўкі на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Па выніках мінулага года для шматдзетных сем'яў пабудавана 8425 кватэр (125 працэнтаў ад гадавога задання). На паляпшэнне жыллёвых умоў накіравана больш як восем тысяч шматдзетных сем'яў. У гэтым годзе з улікам зніжэння колькасці шматдзетных сем'яў плануецца пабудаваць больш як пяць тысяч кватэр і накіраваць на будаўніцтва жылля больш як шэсць тысяч такіх сем'яў».

«БЕЛДЖЫ» ДА ПОСПЕХУ ДАВЯЗЕ

Лідарам продажаў на аўтамабільным рынку краіны сталі кітайскія машыны, зробленыя ў Беларусі

Намеснік дырэктара па маркетынгу і продажах прадпрыемства «БЕЛДЖЫ» Сяргей ХУДАЕШКА. «БЕЛДЖЫ» атрымала восем узнагарод у розных намінацыях, у тым ліку аўтамабілем 2023 года быў прызнаны аўтамабіль Geely Monjaro.

Прадстаўнікі аўтамабільнай асацыяцыі «БАА» расказалі аб асноўных трэндах, якія фіксаваліся на айчынным рынку легкавых машын.

Як паведаміў **дырэктар унітарнага прадпрыемства «БАА-Кансалт» Дзмітрый ЯРОТА**, усяго члены БАА прадалі за мінулы год 25 тысяч 408 новых машын. Гэта на 8174 транспартныя сродкі больш, чым было ў 2022 годзе (плюс 47,5 %). На легкавыя машыны прыйшлося 85,6 % (21 761 штука), а на лёгкія камерцыйныя аўто — 14,4 % (3647 штук). Пры гэтым продажы непасрэдна легкавых машын павялічыліся на 46,6 %.

Дзмітрый Ярота адзначыў, што ўпершыню за апошнія чатыры гады намецілася тэндэнцыя да павышэння павелічэння продажаў. Да гэтага іх аб'ём у дылераў БАА пастаянна падаў: у 2020 годзе — на 18 %, у 2021 годзе — на 11 %, у 2022 годзе — на 63 %. Для параўнання: лідарам быў 2019 год, калі ў краіне было рэалізавана 64 504 машыны.

НЕ ПРАРЫЎ, АЛЕ ЎСЁ Ж

Бягучы вынік за апошнія 10 гадоў з'яўляецца далёка не найлепшым, але сам факт змены тэндэнцыі кажа пра многае.

Падлікі аўтамабільнай асацыяцыі сведчаць, што за мінулы год колькасць мадэляў, якія прадстаўлены на айчынным рынку, скараціласа практычна ўдвая — з 142 да 78. За той жа перыяд колькасць брэндаў знізілася амаль на траціну — з 28 да 20.

Дзмітрый Ярота адзначыў, што адбыліся тэктанічныя зрухі ўнутры асацыяцыі, унутры брэндаў і мадэляў. Улічваючы, што 6–7 новых марак з'явілася ў членаў БАА. Гэта значыць, адбываецца кардынальнае змяненне структуры продажаў асацыяцыі, шмат у чым дзякуючы прыходу на рынак кітайскіх брэндаў, у тым ліку Geely. У 2022 годзе з 28 брэндаў былі прадстаўлены 4 кітайскія, гэта значыць, 14 % ад агульнай колькасці. Летась колькасць кітайскіх брэндаў узрасла да 11 (ужо 55 %). Доля продажаў кітайскіх аўтамабіляў у 2022 годзе склала практычна трэць ад усяго рынку машын (31,7 %), а ў 2023 годзе — 82 %, прычым доля Geely ў гэтым паказчыку дасягнула 87,4 %.

СТАР. 4

КАРАТКА

- Больш як 70 працэнтаў жыхароў Беларусі станоўча ацэньваюць работу мясцовай улады па вырашэнні праблем насельніцтва.
- **Міністэрства аховы здароўя праводзіць манітарынг сітуацыі з чэргамі ў паліклініках.**
- На куплю айчынных тавараў па крэдыце «На родныя тавары» беларусы патрацілі Br15 млн за тры тыдні.
- **«Белавія» аднаўляе рэйсы ў Мурманск.**
- Бяспека ў кожны дом. Акцыя МНС па папярэджанні гібелі людзей на пажарах стартуе 1 лютага.

Выпускніку на заметку

ІНЖЫНЕРНЫЯ І БУДАЎНІЧЫЯ РАБОЧЫЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ САМЫЯ ЗАПАТРАБАВАНЫЯ,

прычым як на рынку працы, так і ў абітурыентаў

Падчас сёлетняй прыёмнай кампаніі ўстановы сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі прымуць амаль 70 тысяч выпускнікоў. Самымі запатрабаванымі як у абітурыентаў, так і на рынку працы з'яўляюцца прафесіі інжынернага профілю, апрацоўчай і будаўнічай сфер. З'явяцца сёлета і новыя спецыяльнасці, запатрабаваныя на высокатэхналагічных вытворчасцях.

Як праінфармавала **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі — начальнік упраўлення прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Аляксандра ПЯТРОВА**, падчас сёлетняй прыёмнай кампаніі выпускнікоў чакае 226 каледжаў (нагадаем, што, згодна з новым Кодэксам аб адукацыі, усе ўстановы прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі аб'ядналі цяпер адной назвай) і 37 іншых установ. Гэта гімназіі-каледжы мастацтваў, вучылішчы алімпійскага рэзерву і філіялы ВНУ, якія навучаюць па праграмах сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

СТАР. 3

ISSN 1990 — 763X

Бяспека

ЗАСЦЕРАГАЦЬ ЛЮДЗЕЙ І РАТАВАЦЬ ІХ ЖЫЦЦІ

Міністэрства па надзвычайных сітуацыях падвяло вынікі дзейнасці за мінулы год

Акрамя таго, падчас калегіі, у якой прынялі ўдзел кіраўніцтва ведамства і дэпартаментаў, кіраўнікі і намеснікі цэнтральнага апарату міністэрства, тэрытарыяльных органаў, падраздзяленняў і арганізацый сістэмы МНС, абмеркавалі перспектыўныя задачы, якія стаяць перад ратавальнікамі. Міністр па надзвычайных сітуацыях Вадзім СІНЯЎСКІ абазначыў праблемныя пытанні і вызначыў прыярытэты на бягучы год.



Фота БелТА.

КОЛЬКАСЦЬ ЗАГІНУЛЫХ У АГНІ І НА ВАДЗЕ СКАРАЦІЛАСЯ

Што датычыцца вынікаў работы ведамства ў мінулым годзе, своечасова прынятыя прафілактычныя меры дазволілі захаваць дасягнутую па выніках 2022 года станоўчую дынаміку зніжэння колькасці пажараў і людзей, якія загінулі на іх. Колькасць пажараў зменшылася на 4,4 % (з 5938 да 5677), загінулых ад іх людзей — на 16,6 % (з 628 да 524 чалавек). Не дапушчана росту дзіцячай гібелі: калі ў 2022 годзе ў агні загінула 14 непаўналетніх, то ў 2023 годзе — дзевяць дзяцей. Стала менш і ўзгарannяў у прыродных экасістэмах. Колькасць загінулых ад такіх узгарannяў зменшылася ў 8 разоў (з 17 да 2 чалавек), а плошчы — у 4 разы. Рэалізаваныя мерапрыемствы па папярэджанні няшчасных выпадкаў на вадзе дазволілі зменшыць колькасць патанулых на 7,3 %, у тым ліку дзяцей — на 22 %.

Як адзначыў міністр па надзвычайных сітуацыях Вадзім Сіняўскі, летась ведамства спрацавала добра па ўсіх паказчыках. І гэта нягледзячы на форс-мажор, які ўзнік у пачатку года, калі Рэспубліканскі атрад спецыяльнага прызначэння «ЗУБР» адправіўся ў Турцыю для ліквідацыі наступстваў землятрусу і выканаў пастаўленыя задачы на ацэнку «выдатна». «Самае галоўнае — станоўчая дынаміка скарачэння колькасці надзвычайных сітуацый, у тым ліку пажараў, гібелі людзей ад іх, захаванне чалавечых жыццяў на вадзе (дынаміка станоўчая ўжо другі год запар), — падкрэсліў кіраўнік ведамства. — Але сённяшнія вынікі і крытычная ацэнка дзейнасці міністэрства сведчаць аб тым, што мы яшчэ толькі на пачатку свайго развіцця. У Год якасці нам трэба пераглядзець свае планы, вызначыць новыя рашэнні ў арганізацыі работы і працягнуць эфектыўную дзейнасць па аказанні дапамогі людзям, якія трапілі ў бяду. Вядома, вялікая ўвага — пытанням прафілактыкі і папярэджання надзвычайных сітуацый».

Міністр расказаў, што падраздзяленні МНС хуткімі тэмпамі аснашчаюцца самай сучаснай тэхнікай. «Набыта новая пажарная аварыйна-ратавальная тэхніка: больш чым 300 адзінак шматлікіх найменняў, — удакладніў Вадзім Сіняўскі. — Пастаўлены на ўзбраенне новыя верталёты «Мі-17» — з усім спектрам ратавальных работ, якія мы толькі праводзім. Па ўсёй краіне ўводзяцца ў эксплуатацыю новыя пажарныя дэпо».

Кажучы аб прыярытэтных кірунках развіцця ведамства ў бягучым годзе, асаблівую ўвагу міністр звярнуў на ўдасканаленне сістэмы перадачы паведамленняў аб надзвычайнай сітуацыі «Маланка». «Сур'ёзная ўвага будзе па-ранейшаму ўдзяляцца пытанням грамадзянскай абароны, — дадаў ён. — Многае ўжо зроблена, але ёсць над чым папрацаваць яшчэ. Гэта і апавяшчэнне нашага насельніцтва, і абарончыя збудаванні, якія павінны быць прыведзены ў адпаведны стан для работы ў асаблівых умовах, і падрыхтоўка ведамства, як дзейнічаць у асаблівых умовах».

Вадзім Сіняўскі выказаў упэўненасць у тым, што МНС зможа вырашыць усе пастаўленыя задачы. «Калектыў дастаткова згуртаваны, ураўнаважаны, — дадаў ён. — Спецыялісты высокага ўзроўню гатовы выконваць сваю работу ў любых умовах: на зямлі, вышыні, пад зямлёй. Ведаем, куды рухацца. Упэўнены, мы справімся з задачамі на ацэнку «добра».

«КАЛЕКТЫЎ ПАДРЫХТАВАНЫ ЯК У ПРАФЕСІЙНЫМ, ТАК І МАРАЛЬНЫМ ПЛАНЕ»

Як адзначыў **дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ**, на выніковай калегіі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях былі разгледжаны ўсе аспекты дзейнасці, а таксама дадзены падрабязны аналіз задач, якія стаялі перад ведамствам у мінулым годзе. «У цэлым ведамства з усімі пастаўленымі задачамі справілася, — падкрэсліў ён. — Прыкметная станоўчая дынаміка ў пытаннях змяншэння пажараў, вырашэння задач, звязаных з ліквідацыяй надзвычайных сітуацый. Менш загінулых па выніках 2023 года. Але калі ёсць хоць бы адзін загінулы, асабліва калі гэта дзіця, то патэнцыял для вырашэння задач яшчэ мае месца быць, а таму трэба прыкладаць усе намаганні, каб гібелі ўвогуле не было».

Па словах дзяржсакратара Савета бяспекі, галоўныя задачы МНС — засцерагаць людзей, ратаваць іх жыцці, не дапускаць узнікнення тых ці іншых катастроф і надзвычайных сітуацый, а ў выпадку іх узнікнення — прафесійна і на высокім узроўні вырашаць задачы па іх лакалізацыі.

Аляксандр Вальфовіч адзначыў работу Міністэрства па надзвычайных сітуацыях на міжнароднай арэне. Ён нагадаў, што ў мінулым годзе супрацоўнікі ведамства прымалі ўдзел у вырашэнні шэрагу задач па выратаванні людзей у Турцыі пасля землятрусу. Акрамя таго, немалую дапамогу авіяцыя МНС аказала гэтай краіне і пры тушэнні пажараў, што праводзіцца на сістэмнай аснове, як і дастаўка гуманітарных грузаў. Пастаўленая задача, каб у Год якасці ратавальнае ведамства працавала з падвоенай нормай.

«Калектыў Міністэрства па надзвычайных сітуацыях падрыхтаваны як у прафесійным, так і маральным плане, — звярнуў увагу дзяржсакратар Савета бяспекі. — Гэта людзі дзяржаўныя, якія бачаць праблемы, што неабходна вырашаць. Калектыў з'яўляецца адным з найлепшых сярод міністэрстваў сілавога блока па вырашэнні ўскладзеных на яго задач. У тым ліку на міністэрства ўскладзены задачы па ўдзеле супрацоўнікаў у вырашэнні задач дзяржаўнай сістэмы рэагавання на акты тэрарызму».

Па словах Аляксандра Вальфовіча, ведамствам вельмі шмат зроблена па паляпшэні сваёй матэрыяльна-тэхнічнай базы, павышэнні якаснай падрыхтоўкі кадраў. Ён прывёў у прыклад Універсітэт грамадзянскай абароны МНС. «Такой базай можа пахваліцца не кожная ўстанова адукацыі, — удакладніў дзяржсакратар. — Там ёсць усё для падрыхтоўкі высакакласных ратавальнікаў, афіцэраў Міністэрства па надзвычайных сітуацыях».

Вераніка КАНЮТА.

Будзьце ў курсе

РОСТ БПМ, А З ІМ — ПЕНСІЙ І ДАПАМОГ НА ДЗЯЦЕЙ

Што зменіцца з 1 лютага?

З 1 лютага гэтага года павялічваюцца ўсе віды пенсій і дзяржаўныя дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей. Рост многіх з гэтых выплат звязаны з павелічэннем бюджэту пражытачнага мінімуму (БПМ). Расказваем, што мяняецца з лютага.

ВЫРАСЦЕ ПАМЕР БПМ

Як паведамляе Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, павялічваюцца памеры бюджэту пражытачнага мінімуму, якія будуць дзейнічаць да 30 красавіка 2024 года. Такім чынам, БПМ у сярэднім на душу насельніцтва ў параўнанні з яго значэннем, устаноўленым з 1 лістапада 2023 года, павялічыцца на 10,6 працэнта і складзе 406,74 рубля. Для працаздольнага насельніцтва ён вырасце да 434,60 рубля, для пенсіянераў — да 298,43 рубля, дзяцей да трох гадоў — да 260,39 рубля, дзяцей ад трох да шасці гадоў — да 349,09 рубля, для дзяцей ад шасці да 18 гадоў — да 406,03 рубля.

Рост гэтага сацыяльнага нарматыву абумоўлены, у першую чаргу, змяненнем якаснага складу мінімальнага набору прадуктаў харчавання, які ўваходзіць у пражытачны мінімум, зацверджаным рашэннем урада, патлумачылі ў Мінпрацы.

Змяненні закрануць каля 1,5 мільёна атрымальнікаў сацыяльных выплат, устаноўленых ад БПМ. Такім чынам, аўтаматычна пераглядаюцца ўбудаваныя ў сістэму сацыяльнай абароны розныя надбаўкі і павышэнні, а таксама асобныя сацыяльныя выплаты, якія вылічаюцца ад памеру БПМ, а менавіта памеры дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, даплаты да пенсій, дапамогі па доглядзе інваліда I групы або асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту, сацыяльныя пенсіі.

ПАВЯЛІЧАЦЦА ДАПАМОГІ СЕМ'ЯМ, ЯКІЯ ВЫХОЎВАЮЦЬ ДЗЯЦЕЙ

З лютага гэтыя дапамогі складуць:

на першае дзіця — 724,85 рубля;

на другое і наступных дзяцей — 828,40 рубля;

на дзіця-інваліда — 931,95 рубля.

Памеры дапамог выраслі на 11,3 працэнта.

Нагадаем, што ў адпаведнасці з Законам «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» памеры дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў пераразлічваюцца два разы на год: з 1 лютага і 1 жніўня.

Памер дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў на першае дзіця складае 35 працэнтаў сярэднямесячнай заработнай платы работнікаў у краіне за квартал, на другое і наступных дзяцей — 40 працэнтаў сярэднямесячнай заработнай платы работнікаў у краіне за квартал, на дзіця-інваліда незалежна ад чарговасці яго нараджэння — 45 працэнтаў сярэднямесячнай заработнай платы работнікаў у краіне за квартал.

Акрамя памераў дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў, якія вылічваюцца з сярэднямесячнай заработнай платы, з 1 лютага на 10,6 працэнта павялічваюцца памеры дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, што вылічваюцца з бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва.

Так, аднаразовая дапамога пры нараджэнні першага дзіцяці зараз складзе 4067,40 рубля (павялічыцца на 389,5 рубля), пры нараджэнні другога і наступных дзяцей — 5694,36 (рост на 545,3 рубля).

Аднаразовая дапамога жанчынам, якія сталі на ўлік у арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці, з лютага будзе выплачвацца ў памеры 406,74 рубля, штомесячная дапамога сем'ям на дзяцей ва ўзросце ад трох да 18 гадоў у перыяд выхавання дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў — у памеры 203,37 рубля.

Памер штомесячнай дапамогі сем'ям на дзяцей, старэйшых за тры гады, з асобных катэгорый сем'яў на дзіця-інваліда складзе 284,72 рубля, на іншых дзяцей у сям'і — 203,37 рубля.

Штомесячная дапамога па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў складзе 406,74 рубля (з I і II ступенню страты здароўя і з III і IV ступенню страты здароўя да спаўнення дзіцяці ўзросту трох гадоў) і 488,09 рубля (з III і IV ступенню страты здароўя пасля спаўнення дзіцяці ўзросту трох гадоў), штомесячная дапамога на дзіця ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраванага ВІЧ, — 284,72 рубля.

Пры выхаванні ў сям'і дваіх і больш дзяцей, адно з якіх ва ўзросце да трох гадоў, выплачваюцца дзве дапамогі: на дзіця да трох гадоў (40 % сярэдняй заработнай платы) і дзіця (дзяцей) ад трох да 18 гадоў (50 % БПМ). Сумарны памер дзвюх дапамог складзе 1031,77 рубля.

У бягучым годзе на выплату дапамог па мацярынстве і сямейных дапамог плануецца накіраваць 3,4 мільярда рублёў, з іх 1,8 мільярда — на выплату дапамог па доглядзе дзяцей ва ўзросце да трох гадоў.

ПАВЫШАЮЦЦА ЎСЕ ВІДЫ ПЕНСІЙ

Згодна з рашэннем кіраўніка дзяржавы, з 1 лютага на 10 працэнтаў павышаюцца ўсе віды працоўных пенсій (па ўзросце, за выслугу гадоў, па інваліднасці, з прычыны страты карміцеля).

З улікам росту бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва на 10,6 працэнта павялічацца даплаты да пенсій і сацыяльныя пенсіі інвалідам і дзецям-інвалідам.

Паводле папярэдняй ацэнкі сярэдні памер пенсіі па ўзросце ў лютым бягучага года складзе 811 рублёў і павялічыцца да студзеня бягучага года на 75 рублёў. Гадавое павелічэнне (люты 2023 да лютага 2024) складзе 140 рублёў, або 21 працэнт.

Памер павелічэння працоўнай пенсіі ў кожнага пенсіянера будзе свой у залежнасці ад працягласці стажу і велічыні заработку, улічаных пры вылічэнні яму пенсіі, а таксама ўстаноўленых даплат да асноўнай пенсіі.

Дадаткова на павышэнне пенсій у лютым будзе накіравана 166 мільёнаў рублёў. У цэлым у лютым расходы на выплату пенсій складуць 1,8 мільярда рублёў.

Атрымальнікамі пенсій з'яўляюцца 2,4 мільёна чалавек.

Алена КРАВЕЦ.

ІНЖЫНЕРНЫЯ І БУДАЎНІЧЫЯ РАБОЧЫЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ САМЫЯ ЗАПАТРАБАВАНЫЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пераважна на ўзровень прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі паступаюць выпускнікі 9-х класаў. Усяго навучальныя ўстановы прымуць каля 40 тысяч выпускнікоў на сярэднія спецыяльныя праграмы і каля 27 тысяч — на прафесійна-тэхнічныя. Некаторыя паступаюць у такія навучальныя ўстановы, каб атрымаць прафесію і выйсці на рынак працы, іншыя разглядаюць іх як першую прыступку для атрымання далейшай адукацыі.

— Можна абраць спецыяльнасці і пайсці развівацца ў пэўнай сферы, напрыклад, галіне будаўніцтва, можна ў працэсе навучання змяніць траекторыю, калі вы разумееце, што абраная сфера не апраўдала чаканні, — адзначыла Аляксандра Пятрова. — Самымі запатрабаванымі на рынку працы з'яўляюцца выпускнікі, якія атрымалі прафесійна-тэхнічную адукацыю, прафесію, прайшлі практыку на прадпрыемстве і навыкі эксплуатацыі абсталявання, а потым перайшлі на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі, атрымаўшы кіраўніцкія, канструктарскія, праекціровачныя кампетэнцыі. Ну і найвышэйшы кампанент яны могуць атрымаць на ўзроўні вышэйшай адукацыі. Такія спецыялісты традыцыйна ў сферы тэхнікі і тэхналогій з'яўляюцца запатрабаванымі, і ў рэальным сектары эканомікі на іх вялікі попыт.

Самы значны ў структуры сярэдняй спецыяльнай адукацыі — інжынерны профіль, спецыялісты для апрацоўчай і будаўнічай галін, гэта больш за трэць навучэнцаў. Вялікімі з'яўляюцца такія профілі падрыхтоўкі, як ахова здароўя, сацыяльная абарона, сельская, лясная, рыбная гаспадаркі, ветэрынарыя і педагагічныя спецыяльнасці.

— Гэтыя спецыяльнасці вельмі запатрабаваныя эканомікай, дастаткова папулярныя і ў абітурыентаў. Профілі педагогіка і ахова здароўя, напрыклад, — адны з лідараў па высокім прахадным бале на спецыяльнасці сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Гэта матываваныя выпускнікі, якія свядома выбіраюць пэўныя сферы і развіваюцца далей. Па інтэграцыі з вышэйшай адукацыяй педагогіка з'яўляецца адной з лідзіруючых сфер. Атрымаўшы педагагічную спецыяльнасць сярэдняй спецыяльнай адукацыі, вялікая доля выпускнікоў паступае затым у ВНУ — як на дзённую, так і на завочную формы. Папулярнай з'яўляецца і завочная форма навучання, — расказала Аляксандра Пятрова.

Што датычыцца прафесійна-тэхнічнай адукацыі, то тут таксама лідзіруе інжынерная, апрацоўчая і будаўнічая галіны. Падрыхтоўка па гэтых спецыяльнасцях займае ўвогуле больш за 70 %.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Тут выпускнікі, як правіла, маюць не менш за дзве прафесіі, якія дазваляюць ім быць больш запатрабаванымі.

— У сельскай гаспадарцы ёсць сезонныя прафесіі, запатрабаваныя ў пэўны час. Наяўнасць другой прафесіі (напрыклад, трактарыст і адначасова слесар па рамонце) дазваляе працаваць круглы год. Гэта папулярная звязка, і такія спецыялісты запатрабаваны, — прывяла прыклад спецыяліст.

Сёлета плануецца адкрыццё дзвюх новых спецыяльнасцяў для падрыхтоўкі рабочых — «Тэхнічная эксплуатацыя мехатронных сістэм электроннай вытворчасці» і «Вытворчасць вырабаў мікра- і нанаэлектронікі». Гэта спецыяльнасці для высокатэхналагічных вытворчасцяў. Таксама плануецца набор па новай спецыяльнасці «Эксплуатацыя сродкаў вымярэння» з прысваеннем кваліфікацыі «Тэхнік-метролаг».

Аляксандра Пятрова паведаміла, што ва ўсіх рэгіёнах праводзяцца кірмашы мэтавай падрыхтоўкі — пляцоўкі для сустрэчы абітурыентаў, іх бацькоў і заказчыкаў кадраў, дзе ў рэальным рэжыме можна абмеркаваць умовы па будучым навучанні і рабоце. Дарэчы, менавіта ў гэты час прадпрыемствы вызначаюцца, ці патрэбны ім спецыялісты, якія будуць навучацца на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі. Лічбы прыёму сфарміруюць на аснове іх заявак.

— Абітурыенты і іх бацькі бачаць, якія прадпрыемствы заявіліся на заключэнне дагавораў па мэтавай падрыхтоўцы і могуць абраць пэўную арганізацыю, заключыць дагавор з арганізацыяй. Далей адбываецца асобны конкурс ва ўстанове адукацыі падчас прыёмнай кампаніі. Падкрэслю, што ў адрозненне ад сістэмы ВНУ на ўзровень прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі набор на мэтавае навучанне ажыццяўляецца падчас звычайнай прыёмнай кампаніі — у тыя ж тэрміны, якія ўстаноўлены для абітурыентаў на агульных падставах. Гэта даволі працяглы час, можна пад'ехаць на прадпрыемства, заключыць дагавор і прэтэндаваць на асобны конкурс. Многія арганізацыі выкарыстоўваюць стымуляцыйныя меры для сваіх работнікаў і падчас навучання даюць пэўную сістэму заахвочванняў, але гэта неабходна абмяркоўваць падчас заключэння дагавораў, — праінфармавала Аляксандра Пятрова.

З якімі прадпрыемствамі супрацоўнічае ўстанова адукацыі, можна пацікавіцца і ў самім каледжы. Там таксама сарыентуюць абітурыента, куды можна звярнуцца для заключэння дагавора аб мэтавай падрыхтоўцы.

Даныя пра ўсе ўстановы адукацыі ёсць на сайце Міністэрства адукацыі. Там жа, а таксама на сайце Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі маюцца абноўленыя даведнікі для выпускнікоў. У саміх навучальных установах можна даведацца, калі яны праводзяць майстар-класы і дні адкрытых дзвярэй.

— Мы рэкамендуем наведаць гэтыя ўстановы адукацыі, паглядзець умовы, у якіх вы будзеце вучыцца і пражываць, пазнаёміцца з калектывам, каб зразумець, ці ваша гэта ўстанова адукацыі. І, канешне, аптымальны варыянт — наведаць прадпрыемства, якое з'яўляецца базавым для гэтай установы адукацыі. Паглядзець умовы, рабочае месца для таго, каб уяўляць, якую сферу эканомікі вы выбіраеце. Установа адукацыі — гэта шлях дасягнення пэўных кампетэнцый, што спатрэбяцца на вашым прафесійным шляху, які будзе доўжыцца не 2-3 гады, а значна больш, таму загадзя мець уяўленне будзе не лішнім, — параіла абітурыентам Аляксандра Пятрова.

Алена КРАВЕЦ.

Лідары

ГРОДЗЕНШЧЫНА ЎРАДЖАЙНАЯ

У якіх гаспадарках у 2023 годзе была дасягнута найбольшая ўраджайнасць сельгаскультур

Лічбы былі агучаны падчас пасяджэння калегіі Мінсельгасхарча па выніках работы аграпрамысловага комплексу за 2023 год і пастаноўцы задач на 2024 год.

Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь Сяргей БАРТАШ паведаміў, што максімальны ўраджай збожжа ў свірнавай вазе атрыманы ў СВК «Свіслач» Гродзенскага раёна — 110 ц/га.

«Па рапсе найбольшая ўраджайнасць у свірнавай вазе атрымана ў СВК «Гродзенскі» — 71,5 ц/га. Рэкордная ўраджайнасць цукровых буракоў — у СВК «Свіслач» (1066 ц/га), звыш 900 ц/га атрымалі таксама чатыры арганізацыі Гродзенскай вобласці», — падкрэсліў кіраўнік ведамства.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

ЗША значна павялічылі продаж зброі за мяжу

Летась амерыканскія абаронныя кампаніі паставілі за мяжу рэкордны аб'ём зброі — на $81 млрд, што звыш чым на 50 працэнтаў больш, чым годам раней. Аб гэтым паведаміла выданне Politico, спасылаючыся на даныя дзяржздэпартамента ЗША. «Агульны паказчык за 2023 фінансавы год з'яўляецца найвышэйшым з 2020 года, калі былы прэзідэнт Дональд Трамп публічна адыграў ролю вядучага прадаўца ваеннай тэхнікі ЗША», — піша газета. Яна адзначае, што «лідзіруючую ролю адыгралі буйныя здзелкі», звязаныя з пастаўкамі зброі Украіне. Дзяржздэп паведаміў, што найбуйнейшымі былі продажы ўдарных і транспартных верталётаў на суму каля $30 млрд, а таксама ракетных установак вялікай далёкасці Польшчы (яна стала адным з галоўных пакупнікоў амерыканскай зброі) і Германіі. Чэхія замовіла найноўшыя знішчальнікі F-35 і боепрыпасы на $5,6 млрд. Балгарыя — бронемашыны Stryker на $1,5 млрд. Нарвегія — шматмэтавыя верталёты на мільярд долараў. Паўднёвая Карэя закупіла F-35 на 5 млрд долараў, Аўстралія замовіла ваенныя транспартныя самалёты C130J-30 Super Hercules на 6,3 млрд, а Японія заплаціць мільярд долараў за разведвальны самалёт E-2D Hawkeye.

Нямецкі даследчы інстытут паведаміў аб істотным зніжэнні тэмпаў развіцця эканомікі ФРГ

Паводле звестак нямецкага інстытута эканамічных даследаванняў IFO, прагноз развіцця эканомікі Германіі на 2024 год быў паніжаны з прычыны таго, што валавы ўнутраны прадукт узрасце ўсяго на 0,7 працэнта замест 0,9 працэнта. Пра гэта паведаміла «Сіньхуа». Паводле інфармацыі IFO, карэкціроўка ў бок паніжэння была заснавана на мерах жорсткай эканоміі, уведзеных бундэстагам у яго бюджэтнай рэзалюцыі, якая была агучана на мінулым тыдні. Ураду Германіі прыйшлося скараціць выдаткі з-за няўдалага перараэмеркавання сродкаў, выдзеленых на барацьбу з COVID-19, а таксама на кліматычныя меры. У гэтым годзе скарачэнне дзяржаўных выдаткаў складзе каля 19 млрд еўра. На думку эксперта IFO, кампаніі і хатнія гаспадаркі адчуюць недахоп фінансавання і матэрыяльнай дапамогі, а дзяржаўныя выдаткі будуць перагледжаны і істотна зрэзаны. Запланаванае ўладамі памяншэнне субсідый у сельскагаспадарчым сектары выклікала пратэсты фермераў па ўсёй краіне.

У Японіі ўвядуць квіткі за ўзыходжанне на гару Фудзі

З 1 лістапада, калі адкрываецца 70-дзённы сезон узыходжанняў, наведвальнікам Фудзі давядзецца плаціць за паход па адным з маршрутаў, якія вядуць на культавую гару. Рэкордная колькасць турыстаў дрэнна адбіваецца на яе захаванасці. Змяншэння колькасці гасцей чакаюць улады прэфектуры Яманасі, якія кантралююць турыстычныя маршруты, у тым ліку і знакамітую сцежку Ёсіда. З лета колькасць турыстаў там будзе абмежавана да 4000 чалавек у дзень, а альпіністам забароняць пачынаць узыходжанне з 4 гадзін вечара да 2 гадзін раніцы. У мінулым годзе на гару Фудзі падняліся звыш 220 тысяч чалавек, прычым больш за палову прайшлі па сцежцы Ёсіда. Афіцыйна тарыфы за ўзыходжанне пакуль не аб'яўлены.

«БЕЛДЖЫ» ДА ПОСПЕХУ ДАВЯЗЕ



ХТО Ў ЛІДАРАХ?

Абсалютным лідарам продажаў у мінулым годзе на айчынным рынку стаў Geely, а следам з вялікім адставаннем ідзе Lada. У цэлым пяцёрка лідараў выглядае наступным чынам:

Geely — 15 706 машын (плюс 260 %);
- Lada — 2684 машын (мінус 29 %);
- Haval — 756 машын (плюс 230 %);
- Audi — 573 машын (плюс 63 %);
- JAC — 346 машын (плюс 578 %).

Самымі папулярнымі мадэлямі легкавых аўто ў Беларусі сталі **Geely Emgrand (5372 машын), Geely Coolray (X50) (4745 машын) і Geely Atlas Pro (2971 машын).**

Продажы лёгкіх камерцыйных аўто выраслі на 52,5 %. Тут лідзіруюць GAZ Gazel Next Van (885 машын), GAZ Gazel Next Track (668 машын) і Volkswagen Transporter (396 машын).

У сваю чаргу **старшыня праўлення аўтамабільнай асацыяцыі «БАА» Сяргей ВАРЫВОДА** заявіў, што мінулы год паказаў даволі высокую адаптацыю айчыннага рынку да негатыўных працэсаў, заўважыўшы пры гэтым, што захаваліся дылерскія цэнтры, забяспечана занятасць, прапанова на рынку не звузілася.

СЁЛЕТА ЧАКАЮЦЬ РОСТ НА ЧВЭРЦЬ І... У СЕМ РАЗОЎ

Беларускія аўтамабільныя дылеры прагназуюць попыт на легкавушкі ў 2024 годзе. Такім чынам, плануецца, што рост продажаў складзе 25 %, заявіў старшыня праўлення.

Сяргей Варывода адзначыў, што ўдзел у прагназаванні прынялі 16 дылераў. «Кансэнсус-прагноз па групе легкавых аўтамабіляў, на думку аўтадылераў, на 2024 год складзе (продаж) 26 850 легкавых аўтамабіляў, рост да 2023-га каля 25 %».

На рынку краіны з'явіцца не менш чым 28 новых мадэляў легкавых аўтамабіляў. Цана на легкавушкі павінна застацца стабільнай, моцнага росту не прагназуецца. Ён дадаў, што на гэта станоўча паўплывае рост даходаў насельніцтва і даступнасць крэдытаў.

Паводле прагнозаў аўтамабільных дылераў, на аўтамабільным рынку сёлета цэны рвануць не павінны. Усе апытаныя дылеры заявілі, што ў першым паўгоддзі новыя аўто не падаражэюць больш чым на 5 %.

Акрамя таго, аўтамабільныя дылеры збіраюцца прадаць у наступным годзе не менш за 1,9 тысячы электрамабіляў (а гэта ўжо ў сем разоў больш, чым у мінулым годзе) і каля 4,5 тысячы лёгкіх камерцыйных аўтамабіляў.

Лёгкі камерцыйны транспарт — гэта аўтамабілі, поўная маса якіх павінна складаць не больш за 3,5 тоны (лёгкія грузавікі, фургоны, пікапы, а таксама мікрааўтобусы, у якіх не больш за 16 месцаў).

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ВЫНІКІ І ПЛАНЫ НАШАГА ЗАВОДА

Айчынны завод «БЕЛДЖЫ» ў мінулым годзе цалкам выканаў усе планы па вытворчасці і продажы машын. На айчынны рынак рэалізавана 15 тысяч 705 аўтамабіляў, што ў тры разы больш, чым у 2022 годзе. Характэрна, што 10 315 аўтамабіляў набылі фізічныя асобы, аб'ём продажаў юрыдычным асобам склаў 5335 машын, з іх 1278 штук купілі бюджэтныя арганізацыі.

Экспертамі завода падлічана: усяго ў нашай краіне ўжо рэалізавана больш за 50 тысяч такіх аўтамабіляў.

Пашыраецца і сэрвісная сетка завода, заявіў **генеральны дырэктар прадпрыемства Генадзь СВІДЗЕРСКІ** падчас прэс-канферэнцыі. На сёння ў краіне паспяхова функцыянуюць 33 сэрвіс-цэнтры, а ў першым квартале плануецца адкрыццё яшчэ двух падобных цэнтраў у Мінску.

Дырэктар адзначыў, што летась на рынак былі выпушчаны новыя мадэлі Geely Okovango, Geely Monjaro, Geely emgrand. Па мадэлі Geely emgrand праведзены комплекс работ па яе мадэрнізацыі, і ў першым квартале бягучага года на рынак выйдзе абноўленая версія аўтамабіля з шасцісту-пеньчатай аўтаматычнай каробкай перадач, у якой будзе атмасферны 1,5-літровы рухавік, а таксама мадыфікацыя з механічнай каробкай перадач.

Кампанія «БЕЛДЖЫ» сёлета збіраецца выпусціць рэстайлінгавыя варыянты папулярных мадэляў аўтамабіляў Geely, анансуе Генадзь Свідзерскі.

Ён адзначыў, што вынікам продажаў летась у «БЕЛДЖЫ» задаволеныя, Geely сталі лідарам продажаў у краіне. Па словах Генадзя Свідзерскага, галоўнай задачай, якая была вырашана ў 2023 годзе, стала набыццё ліцэнзіі на самую прадаваную мадэль, у выніку з'явіўся Belgee X50.

«Мы пераходзім на новы ўзровень, маючы сёння дакументацыю, больш актыўна запускалі працэсы лакалізацыі з нашымі партнёрамі. Мы лічым, што гэтая мадэль, праходзячы розныя ўдасканаленні, будзе доўга жыць на рынку. І гэта тая мадэль, дзе мы лічым, што ўсе сакрэты праграмна-апаратнага комплексу сучаснага аўтамабіля будуць намі асвоены», — сказаў генеральны дырэктар.

Ён удакладніў, што кампетэнцыі па легкавых аўто будуць назапашвацца ў Беларусі і дазволяць удасканальваць канструкцыю машын. Таксама Geely збіраецца захаваць заваяваныя пазіцыі на рынку.

У прыватнасці, будзе праведзены рэстайлінг седана Emgrand, бо машына карыстаецца вялікай папулярнасцю. Акрамя таго, збіраюцца правесці рэстайлінг мадэлі Okavango, X50 з чатырохцыліндравым рухавіком і Atlas. Генадзь Свідзерскі дадаў, што аснову мадэльнага шэрагу ў бягучым годзе складуць раней асвоеныя мадэлі, а таксама абноўленыя версіі.

Сяргей КУРКАЧ.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Грамадства

ВАЖНЕЙ ЗА ЎСЁ — ЗДАРОЎЕ, БАЦЬКІ І ДЗЕЦІ

Сталі вядомыя вынікі чарговага сацыялагічнага даследавання, праведзенага аналітычным цэнтрам EcooM

Даследаванне праводзілася ў студзені 2024 года, усяго было апытана 1240 рэспандэнтаў у населеных пунктах усіх рэгіёнаў Беларусі. Статыстычная памылка выбаркі не перавышае 2,5 працэнта. Яго вынікі сведчаць, што найбольш беларусы цэняць здароўе, бацькоў, дзяцей. А вось кар'ерныя імкненні і высокі статус у грамадстве — у меншай ступені.

Так, адказваючы на пытанне «Што для вас у жыцці з'яўляецца найбольш важным?», большасць рэспандэнтаў назвалі здароўе, бацькоў, душэўны спакой і камфорт, дзяцей. Матэрыяльная забяспечанасць размясцілася на пятым радку, а замыкае шасцёрку каштоўнасцяў муж (жонка) або любімы чалавек.

Кар'ерны рост і грамадскі статус жыхары Сінявокай лічаць найменш важнымі бакамі свайго жыцця. Магчымасць уплываць на іншых людзей увогуле аказалася на апошнім месцы. Сацыёлагі адзначаюць, што адказ «Мець уладу, магчымасць уплываць на іншых людзей» на два балы (па пяцібальнай шкале) адстаў ад каштоўнасці здароўя.

У аналітычным цэнтры зазначылі, што такая сітуацыя апошнім часам характэрна для многіх краін свету. Абумоўлена гэта ў першую чаргу ковіднымі абмежаваннямі. Хоць у нашай краіне яны дзейнічалі больш мякка і гібка, але гэты фактар, тым не менш, значна паўплываў на ўзмацненне ўвагі да ўласнага здароўя.

Таксама падчас даследавання сацыёлагі адзначылі імкненне беларусаў да дасягнення прафесіяналізму ў сваёй справе, інтарэс да цікавай работы і грамадска карыснай працы.

Уладзімір ВЯРЭНІЧ.

Што для Вас у жыцці з'яўляецца самым важным?



Апытана 1240 рэспандэнтаў у студзені 2024 года з захаваннем прынцыпу рэпрэзентатыўнасці для насельніцтва Рэспублікі Беларусь. Статыстычная памылка выбаркі не перавышае 2,5%.

Крыніца: Аналітычным цэнтрам EcooM па заказе Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

© Інфаграфіка

Даты

Гонар быў па заслугах

Сёлета, 31 студзеня, спаўняецца 100 гадоў з дня нараджэння Героя Савецкага Саюза палкоўніка ў адстаўцы І. І. Кустава.
Родам Іван Ільіч са шматдзетнай сялянскай сям'і, са Свярдлоўшчыны. Пасля сямігодкі працаваў прычэпшчыкам і запраўшчыкам у калгасе. З пачаткам вайны яго бацька і старэйшы брат пайшлі ваяваць. Івана дабравольцам не ўзялі...

Прызвалі хлопца толькі праз год — накіравалі ў Свярдлоўскае пяхотнае вучылішча.

Пасля вучобы (па паскоранай праграме) малады афіцэр стаў камандаваць узводам з двух дзясяткаў бывалых і куды старэйшых салдат, якія, на шчасце, з разуменнем прынялі новага камандзіра і вельмі шмат чаму навучылі...

У пачатку 1945-га капітан Кустаў ужо камандаваў ротай 1052-га стралковага палка 301-й стралковай дывізіі. Разам з аднапалчанамі прымаў удзел у вызваленні ад фашысцкай нечысці Украіны, Малдавіі, Румыніі, Польшчы, на заключным этапе вайны — у Вісла-Одэрскай наступальнай аперацыі. Член Ваеннага савета 5-й Ударнай арміі генерал-лейтэнант Ф. Е. Бокаў у мемуарах «Вясна Перамогі» пісаў: «301-я дывізія вытрымала магутны ўдар гітлераўскай пяхоты і танкаў... Увесь дзень ішоў агнявы і рукапашны бой на рубяжы ад заходняга берага ракі Паліца, чатырнаццаць разоў хваля за хваляй вораг падымаўся ў контратакі... 14 студзеня рота Кустава на чале з камандзірам кідком уварвалася ў траншэі праціўніка, дзе завязаўся рукапашны бой. На наступную раніцу падраздзяленне фарсіравала раку Паліца, выбіла немцаў і заняло кругавую абарону на супрацьлеглым беразе, захапіла і ўтрымлівала плацдарм да падыходу асноўных сіл...». Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР за праяўленыя мужнасць і гераізм капітан Кустаў быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза.

Герою быў 21 год.

Вестку пра Перамогу ён сустрэў у шпіталі, пасля якога, нягледзячы на заключэнне медкамісіі, вярнуўся ў рады Узброеных сіл: праходзіў службу ў Беларускай ваеннай акрузе, займаў адказную пасаду ў Мінскім абласным ваенкамаце, правёў безліч сустрэч з моладдзю і ў працоўных калектывах.

...Палкоўнік Кустаў узнагароджаны многімі ордэнамі і медалямі. Яму было чым ганарыцца, але найбольш, напэўна, тым, што выпаў гонар 20 красавіка 2010 года разам з Прэзідэнтам краіны закласці капсулу з сімвалічным пасланнем нашчадкам у падмурак новага будынка музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Мікалай Шаўчэнка, *г. Мінск.*

Вопыт

Усё пачалося з мары. І кнігі...

У Год якасці і 100-гадовага юбілею Бярэзінскага раёна наша бібліятэка распачала новы творчы праект — «Землякі са знакам якасці». У планах — расказаць пра многіх, кім ганарыцца наша зямля, аднак першай была вечарына-прысвячэнне знакамітым жанчынам: з 12 яркіх ураджэнак Бярэзіншчыны гераінямі абралі дзвюх.

Роза Адамаўна Сярмяжка-Зінава — дзяўчынка з простай сялянскай сям'і, з вёсачкі Старая Князеўка — яшчэ са школы марыла стаць геолагам. У 1953 годзе паехала паступаць у Ленінградскі ўніверсітэт. Медалісты ў той час і там экзамены не здавалі, з імі праводзілі гутарку. Пры адказах на пытанні выпускніца беларускамоўнай школы не-не ды ўжывала тэрміны, словы з роднай мовы, тут жа, сама перакладала іх на рускую і трымалася вельмі ўпэўнена, бо адчувала, што веды, атрыманыя школе, ніколькі не горшыя, чым у іншых...

Пасля атрымання дыплома (прычым з адзнакай!) маладога спецыяліста запрашалі на работу ў Ленінградскі інстытут геабатанікі, аднак дзяўчына сама выбрала адзін з самых далёкіх пунктаў Савецкага Саюза — Караганду. І потым, калі можна так казаць, паставіла асабісты рэкорд: прайшла ў экспедыцыях ад Ціхага акіяна да Балтыйскага мора.

Дваццаць доўгіх гадоў геолаг Роза Сярмяжка-Зінава была далёка ад Беларусі, не чула роднага слова. Каб не забыцца яго, выпісвала часопіс «Беларусь», чытала, часта ўслых, для свайго мужа — рускага па нацыянальнасці, а неяк...

Лёсавызначальным стаў для жанчыны Міжнародны сімпозіум па геалогіі і фаўне Еўропы, дзе пашчасціла пазнаёміцца з беларускім акадэмікам і вялікім патрыётам Гаўрылам Іванавічам Гарэцкім. Менавіта ад яго Роза Адамаўна пачула мудрае: «Беларус павінен працаваць у Беларусі».

Час і сапраўды расставіў акцэнты: абараніўшы дысертацыю, і «зматаўшы ў клубок дарогі», яна прыйшла працаваць у Інстытут геахіміі і геафізікі АН БССР, выкладаць — па-беларуску — геаграфію ў сталічных школах. Нямала паездзіўшы па свеце, Роза Адамаўна пераканалася: найлепшае месца на зямлі тое, дзе ты нарадзіўся, найлепшыя пахі — лесу і сушаных грыбоў. 15 лютага нашай шаноўнай зямлячцы спаўняецца 89 гадоў.

...Шлях ад участковага педыятра да кіраўніка Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра прайшла ўраджэнка Беразіно **доктар медыцынскіх навук, дацэнт Элеанора Кузьмінічна Капітонова.** Стажыравалася ў найлепшых клініках Савецкага Саюза і за мяжой. Дасканалае валоданне англійскай мовай дазваляла ёй лёгка кантактаваць з калегамі на прэстыжных сімпозіумах, выступаць з лекцыямі на міжнародных сесіях Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. Пра яе зняты дакументальны фільм, біяграфія прадстаўлена ў энцыклапедыі «Хто ёсць хто ў Беларусі»...

А пачалося ўсё з... кнігі. У восьмым класе ў рукі дзяўчынцы трапіў раман Юрыя Германа «Справа, якой ты служыш» і...

Выбар быў зроблены: толькі медыцына.

Першая прыступка да прафесіі — Гродзенскі медінстытут, дзе яна паспявала і выдатна вучылася, і ўзначальваць камсамольскую арганізацыю, другая — кандыдацкая дысертацыя, прадстаўленая на Усесаюзны конкурс навукова-даследчых работ маладых вучоных і адзначаная прэміяй АН СССР. Далей — пасады першага прарэктара Гомельскага медінстытута, першага дырэктара РНПЦ радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека...

Ужо на заслужаным адпачынку Элеанора Кузьмінічна ўзначаліла першы і адзіны ў Беларусі інфармацыйна-асветніцкі цэнтр аздараўленчага харчавання і садзейнічання здароўю.

...Інтэлігентная сталічная дама і сёння радуецца кожнаму пражытаму дню: пад гітару спявае рамансы (музыка — добры лекар), піша вершы (гімнастыка для душы), штодзённа ў любое надвор'е праходзіць 6—10 кіламетраў.

...Відавочна: бярэзінскай моладзі ёсць на каго раўняцца і з каго браць прыклад. Мы, супрацоўнікі бібліятэкі, стараемся дапамагчы ім выбраць годныя арыенціры.

Тамара Круталевіч, *г. Беразіно.*

Весткі з месцаў

Асобы сышлі... Засталася памяць

Здымкі, біяграфіі, уклад у гісторыю і развіццё горада 240 асоб, памяць якіх увекавечана ў назвах гродзенскіх вуліц, пад вокладку аднаго біябібліяграфічнага даведніка сабралі супрацоўнікі цэнтральнай гарадской бібліятэкі. Для пошуку патрэбных звестак выкарыстоўваліся не толькі друкаваныя крыніцы і матэрыялы інтэрнэт-рэсурсаў, але і дакументы, якія захоўваюцца ў Дзяржаўным архіве Гродзенскай вобласці, у гісторыка-археалагічным музеі.

Усяго ў горадзе налічваецца больш чым восемсот вуліц, завулкаў, праспектаў, плошчаў... Каля траціны іх носяць імёны выдатных людзей як мінуўшчыны, так і сучаснасці: сярод жанчын — Элізы Ажэшкі, Цёткі, Веры Харужай, Валянціны Церашковай... Сярод дзеячаў рэвалюцыйнага руху — Хаіма Александровіча, Арцёма, Юльяна Бакштанскага, Антона Баранцэвіча... Сярод герояў Вялікай Айчыннай — Льва Давацара, Дзмітрыя Карбышава, Агадыла Сухамбаева... Сярод дзеячаў мастацтва — Льва Бакста, Войцэха Багуслаўскага, Валенція Ваньковіча, Міхаіла Глінкі... Максіма Багдановіча, Якуба Коласа і Янкі Купалы, Кандрата Крапівы, Уладзіміра Караткевіча, Аркадзя Куляшова, Янкі Маўра, Адама Міцкевіча, Міхася Васілька, Аляксея Карпюка і інш.

Даведнік будзе цікавы гісторыкам, краязнаўцам, супрацоўнікам музеяў і архіваў, сродкаў масавай інфармацыі, ідэалагічным работнікам, педагогам, усім, хто цікавіцца гісторыяй і сучасным жыццём горада.

Інеса Ілюшына, *г. Гродна.*

Чалавек — чалавеку

З КАХАНЫМІ НЕ РАССТАВАЙЦЕСЯ,
альбо У дарослых, як у дзяцей

У маладосці мой муж часта ездзіў у камандзіроўкі: калі на тыдзень, калі на два. Вяртаўся кожны раз з падарункамі, якія купляў на сэканомленыя грошы. Але ж дарагімі для мяне былі зусім не яны, а клопат каханага чалавека, часовыя разлукі з якім толькі ўмацоўвалі нашы пачуцці.
Цяпер — і, здаецца, усё часцей — сутыкаешся з тым, што яны... знікаюць.

...Чарга ў касу была досыць доўгай. Ззаду ў мяне стаялі двое маладых мужчын гадоў, можа, трыццаці.

— Чатыры месяцы ў Расіі на заробках быў, — расказваў адзін другому. — Дома — усяго толькі тыдзень. І — не паверыш — жонка ведае, што ў мяне калена баліць, бачыць, што кульгаю. А ні разу не сказала, што трэба схадзіць да доктара, палячыцца... Затое сёння за раніцу тры разы папыталася, калі ўжо паеду назад? Ёй ад мяне толькі грошы патрэбны, каб новых шмотак сабе купіць ды золата начапляць...

— А я ж папярэджваў, што разлука да дабра не давядзе, — азваўся суразмоўца. — Жонка, пэўна, адвыкла пра некага клапаціцца, шкадаваць... Ты, як выглядае, цяпер не столькі муж для яе, колькі банкамат. Так што кідай свае раз'езды, вяртайся на завод. Глядзіш, і дома ўсё наладзіцца, сям'ю ўратуеш...

Да чаго гэтыя маладыя людзі дамовіліся, я, на жаль, не пачула: падышла мая чарга ў касу, трэба было разлічвацца за прадукты.

Потым, па дарозе дамоў, я думала пра пачутае і міжволі ўспамінала свайго... унука. У першым класе ён, як расказваў, моцна закахаўся ў Дашу з прадоўжанкі. Але ў наступнай чвэрці ў тую прадоўжанку больш не пайшоў, і яны з Дашай рассталіся... Другой сімпатыяй стала аднакласніца Аліна. І зноў наступілі канікулы, яны доўга не бачыліся, і каханне прайшло...

У дарослых, выходзіць, як у дзяцей, ці што?

...З гэтымі думкамі зайшла ў кватэру. З залы, дзе стаіць тэлевізар, насустрач мне данеслася прыгожае: «С любимыми не расставайтесь, с любимыми не расставайтесь...»

Гэта муж — і каторы ж раз?! — глядзеў па тэлевізары «Іронію лёсу, ці З лёгкай пары!»

Н. Сямёнава, *г. Гомель.*

Усмешачку

Як гукнеш, так і адгукнецца...

Шмат розных бываліц пра паляўнічых ды рыбаловаў — не меней, мусіць, пра дачнікаў. У нас вось лецішчы Ганны і Андрэя (назавём іх так) знаходзяцца побач. Здавалася б, суседзі — павінны сябраваць. Аж не: няма ў іх блізкіх адносін. Што ёсць? Не ведаю, як і назваць.

...Ганна ўвосень капала бульбу. Усім хвалілася, што ў яе новы сорт, што вельмі ж удалы! Бульбачка, маўляў, і смачная, і разварыстая, і ўрадзіла так, што не абабрацца!

— Дык, можа, прадасі вядзерца? — спытаў Андрэй. — Я таксама пасадзіў бы.

— Не, нават не прасі, — з форсам адмовіла суседка. — Мая бульбачка догляд любіць, а ты, нябось, і не праполеш як след, і не пальеш, і жукоў не збярэш, а потым папракаць мяне будзеш, што не вырасла, што ўраджаю няма... Так што выбачай.

Прайшоў нейкі час, і ўжо Ганна падышла да Андрэя. Кажа:

— Надта ж добрыя ў цябе клубніцы былі. Новы сорт... Дык, можа, трохі вусоў дасі, — я таксама пасадзіла б.

— Не... І не прасі, — рашуча адказаў сусед, успомніўшы размову пра бульбу. — Мае клубніцы і без клопату файна растуць. А ты — я ж ведаю — даглядаць іх кінешся: палоць, падліваць угнаеннямі. Калі так, яны па добрым яблыку будуць — цэлымі ў рот не пакладзеш! А пачнеш адкусваць, — апошнія зубы зломіш. Скажаш, што я вінаваты. Так што выбачай!

...Няма, карацей, сяброўства. І варажнечы няма: культурныя людзі.

Васіль Кабачэўскі, *г. Орша.*

Спрыяць духоўнаму росту чалавека

Нацыянальная бібліятэка Беларусі і Беларуская праваслаўная царква падпісалі Пагадненне аб супрацоўніцтве. Па меркаваннях бакоў, гэта дазволіць вывесці іх узаемадзеянне на новы ўзровень, дасць магчымасць і надалей рэалізоўваць цікавыя, карысныя і патрэбныя нашаму грамадству праекты і ініцыятывы. Адразу пасля падпісання ў сценах кніжнай скарбніцы прайшоў навуковы круглы стол «Духоўнасць і культура: традыцыі і сучаснасць», дзе прадстаўнікі навуковых і рэлігійных колаў узнялі шэраг важных і актуальных тэм.

Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі ВЕНІЯМІН, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі ва ўступным слове звярнуў увагу на тое, што сёння ў свеце востра адчуваецца духоўны крызіс, які выяўляецца стратай чалавекам сэнсу свайго быцця і прызначэння:

— Глабалізацыя і тэхналагічны прагрэс, якія забяспечваюць усё больш камфортнае існаванне, вядуць і да ўсё большай страты чалавекам сваёй індывідуальнасці, да духоўнай расслабленасці. Асобаснае прызначэнне становіцца для чалавека ўсё больш невыразным і нават цяжкім. Як і для грамадства, што найбольш бачна праяўляецца ў сыходзе ад класічнай, універсальнай адукацыі. Нават цэлыя супольнасці не здольныя ўспрымаць адказы, якія дае хрысціянства. Што такое свабода і ў чым сапраўдны сэнс творчасці, прызначэння, мастацтва? Дыскусіі па гэтых пытаннях, калі і ўзнікаюць, то вельмі часта вядуцца без звароту да духоўнай традыцыі. У той жа час звычайны чалавек усё ў большай ступені пачынае разумець, што знаходзіцца ў стане адчужэння, занядбанасці, разгубленасці... Чалавек усё больш адчувае такое адасабленне, якое не прыносіць яму ні карысці, ні радасці, а больш абцяжарвае яго душу. Абавязак, свабода, маральнасць у яе высокім выяўленні, здольнасць да творчасці — гэтыя асноватворныя характарыстыкі чалавека дадзены яму, як і дадзена жыццё. А духоўнасць — тое, што звязвае яго са Стваральнікам, — адзначыў Уладыка. — Менавіта так царква разумее сэнс чалавечага існавання. Суадносіны і ўзаемасувязь свету духоўнага і свету культуры. З прыняццем хрысціянства духоўна-маральныя арыенціры напоўнілі свет, культуру і мастацтва нашага народа глыбокім зместам і ўнутранай прыгажосцю, вызначыўшы іх высокае прызначэнне — спрыяць духоўнаму росту чалавека. Нездарма цудоўныя творы, думкі, сцвярджэнні, сабраныя на беларускай зямлі, занялі годнае месца ў скарбніцы сусветнай культуры. Гэты прынцып духоўнага пачатку, мяркую, павінен быць пакладзены ў аснову пагаднення, якое мы падпісалі.

Двухбаковае пагадненне мае на ўвазе правядзенне навукова-даследчых, адукацыйных, асветніцкіх, культурных і культурна-масавых мерапрыемстваў у сценах Нацыянальнай бібліятэкі. У ходзе круглага стала прысутныя абмеркавалі шэраг важных і актуальных тэм. Напрыклад, пагаварылі пра ідэалагічныя прынцыпы ўзаемадзеяння дзяржавы і царквы на сучасным этапе.

— Як бы мы ні казалі пра сур'ёзныя пазіцыі царквы і рэлігійных арганізацый, тым не менш устойлівымі застаюцца тэндэнцыі секулярызацыі. У Заходняй Еўропе, Лацінскай Амерыцы скарачаецца колькасць прыходаў. Сацыялагічныя апытанні паказваюць супярэчлівую рэакцыю звычайных людзей на гэта... Разам з тым наша дзяржава ва ўзаемаадносінах з царквой ідзе сваім шляхам, не капіруючы мадэль заходнееўрапейскіх альбо нейкіх іншых краін. Кіраўнік нашай краіны неаднаразова казаў пра тое, што ў аснове ідэалогіі павінны быць біблейскія, традыцыйныя каштоўнасці. Дзяржава ў нас свецкая, але ў ёй аднолькава паважаюцца правы розных канфесій. Разам з тым менавіта беларуская праваслаўная царква з'яўляецца прыхільніцай усіх нашых адукацыйных, культурных праграм. Яна шчыльна звязана з гісторыяй развіцця беларускай дзяржаўнасці», — зазначыў **генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі кандыдат гістарычных навук Вадзім ГІГІН.**

Архімандрыт Афанасій, рэктар Мінскай духоўнай акадэміі, нагадаў прысутным пра духоўныя запаветы беларускіх святых. Ён згадаў цытату Уладыкі Філарэта. «Гісторыя Белай Русі не будзе поўнай без прыкладаў падзвіжніцкага жыцця многіх уходнікаў Божых. Яны падобныя крыніцам жывой вады, з дапамогай якіх мы наталяем сваю духоўную смагу, пры знаёмстве з тым ці іншым перыядам гісторыі беларускага народа. Яны падобны пуцяводным зоркам, якія асвятляюць сабой часам вельмі цёмную прастору нашага шматпакутнага мінулага і служаць незаменнымі арыенцірамі на шляху пазнання гэтага мінулага. Таму што без іх гісторыя губляе сэнс».

Загадчык кафедры царкоўнай гісторыі і царкоўна-практычных дысцыплін Мінскай духоўнай акадэміі, кандыдат гістарычных навук Валянціна ЦЯПЛОВА, спынілася ў сваім дакладзе на традыцыях у культуры, на якія паўплывала дзейнасць праваслаўнай царквы. Яна нагадала пра 200-годдзе археаграфіі Беларусі, калі свет убачыла выданне «Беларускі архіў старажытных грамат» протаіерэя Іаана Грыгаровіча — першы зборнік дакументаў па гісторыі Беларусі.

— Іаан Грыгаровіч нарадзіўся на Магілёўшчыне ў сям'і святара. Яму, як відаць, адкрывалася прызначэнне ісці па слядах свайго бацькі ад настаўніка павятовага вучылішча да святарскага служэння. Але знаёмства і супрацоўніцтва з дзяржаўным канцлерам графам Мікалаем Румянцавым прывяло да рэзкага павароту ў яго лёсе. Ацаніўшы здольнасці маладога чалавека, Румянцаў выдзеліў сродкі, каб Іаан Грыгаровіч змог працягнуць навучанне ў Санкт-Пецярбургскай духоўнай акадэміі. Менавіта там праявілася схільнасць будучага археографа да гістарычных даследаванняў, — распавядае Валянціна Анатолеўна. — Вярнуўшыся пасля вучобы да бацькі, сын не памяняў курс, працягваў сваю даследчыцкую дзейнасць. Ён разбіраў Гомельскую бібліятэку Румянцава, наведваў манастыры, збіраў арыгіналы дакументаў і копіі старадрукаваных кніг. Пазней гэтыя матэрыялы сталі асновай для зборніка дакументаў па гісторыі Беларусі, які ён апублікаваў у 1824 годзе.

Вучоны планаваў выдаць «Беларускі архіў старажытных грамат» у дзвюх частках, але ўдалося спраўдзіць задуму толькі на палавіну. Другая частка так і засталася ў выглядзе рукапісаў, якія зараз захоўваюцца ў Цэнтральным дзяржаўным архіве літаратуры і мастацтва. Валянціна Цяплова адзначыла, што перавыданне дзвюх частак «Беларускага архіва...» як адзінага помніка беларускай культуры такога кшталту сёння проста неабходнае, бо гэта вельмі каштоўная крыніца ведаў па грамадзянскай і царкоўнай гісторыі нашай краіны.

Алена ДРАПКО.

Праз абрысы і лініі

Сёння мала хто ведае, што ў юнацтве Васіль Быкаў марыў стаць не пісьменнікам, а прафесійным мастаком. Ён нават навучаўся на жывапісным аддзяленні Віцебскага мастацкага вучылішча, скончыць якое яму не давялося з-за недахопу грошай. І тым не менш маляваць Быкаў не кінуў. На паперы ён пакінуў не толькі выявы мясцін, дзе пабываў, хаты, у якой гадаваўся, а нават іранічныя, падобныя да коміксаў замалёўкі, што сведчаць пра побытавыя рэчы і нават розныя сітуацыі, у якія трапляў іх аўтар.

Напрыклад, на малюнку з подпісам «момант ганьбы» ён паказаў, як яго спыніў інспектар дзяржаўтаінспекцыі. Замаляваў Быкаў і свае паходы да дактароў, паездкі на дачу і тое, як важдаецца з аўтамабілем (прынамсі, ва ўспамінах Быкаў прызнаваўся, што догляд за машынай у яго забірае шмат часу). Сярод цікавінак — падрабязна апісаны і намаляваны ў нататніку камп'ютар, калі Быкаў стараўся асвоіць новую тэхніку.

Пабачыць гэтыя работы, а таксама дакументы, рукапісы, асабістыя рэчы класіка, сярод якіх — яго эцюднік, фарбы, нататнікі, паліто, можна ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры на літаратурна-мастацкай выстаўцы «Васіль Быкаў. Жыццё праз абрысы і лініі». **Дырэктар музея Сяргей УСІК** заўважыў, што гэта першае мерапрыемства з тых, што запланаваны і прымеркаваны да стагоддзя з дня нараджэння пісьменніка.

Часовая экспазіцыя — спроба распавесці пра Васіля Быкава з іншага пад'ходу, паказаць шматграннасць асобы. Нягледзячы на тое што выяўленчая спадчына Васіля Быкава налічвае сотні адзінак, яна да нашага часу застаецца мала вядомай многім з прыхільнікаў яго твораў.

На выстаўцы прадстаўлена больш за 70 графічных і жывапісных работ Васіля Быкава. Многія з іх раскрываюць яго характар, а таксама эмоцыі, якія ён змог перадаць нават у няхітрых замалёўках. Напрыклад, побач з асобнікам «Жураўлінага крыку» (першай кнігі пісьменніка) у экспазіцыі змешчаны яго малюнак, прысвечаны гэтай падзеі. У ганарлівай фігурцы з задраным угору носам ён паказаў, што адчуваў, калі адбыўся як пісьменнік.

Малюнкі можна пабачыць і на рукапісах класіка. На некаторых з іх пазначаны пэўныя схемы, магчыма, планы размяшчэння герояў, а можа, тое, як аўтар узгадваў ці ўяўляў падзеі.

— Мне падаецца часам, што, калі б не мастацтва, мог бы не адбыцца цудоўны пісьменнік з такім выяўленчым словам. Яго творы не проста адчуваеш, а, быццам, бачыш асяроддзе і падзеі, і гэта ўжо не кажучы пра тое, як дакладна апісаны людзі, іх паводзіны, характары, — прызнаецца **старшы навуковы супрацоўнік музея, куратар выстаўкі Ірына КНЯЗЕВА.**

Эцюднік і фарбы Васіля Быкава.

Класік вывучае новую тэхніку.

Прагу да малявання Быкаў іранічна называў «мастацкім свербам» і нават перадаў гэта ў адным са сваіх малюнкаў. Праз абрысы і лініі можна прасачыць жыццё аўтара. Малюнкі Быкава супрацоўнікі музея пастараліся дапоўніць рэчамі. Так, у раздзеле экспазіцыі, прысвечаным маленству, размешчана першая кніга, якую маленькаму Васілю прачытаў яго бацька. Ні ён, ні маці, як народны пісьменнік апісаў у сваіх мемуарах, яго творы не чыталі. Бацька ў пэўны час страціў зрок, акулярамі прынцыпова не карыстаўся. Калі ж іншыя зачыталі яму твор сына, з задавальненнем паслухаў, але сказаў, што ў Лынькова было цікавей.

Быкаў маляваў і ў перапынках паміж баямі. На жаль, гэтыя работы не захаваліся, згарэлі. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, яму было ўсяго сямнаццаць гадоў. Супрацоўнікі музея ўзялі за аснову карту 1941 года і пазначылі на ёй, які баявы шлях прайшоў будучы класік, у якіх гарадах ён пабываў. Дарэчы, у свой час Быкаў вельмі цікавіўся картаграфіяй, падоўгу мог разглядаць розныя карты.

Трэба сказаць, што малюнкі Быкава ўжо часткова выстаўляліся. Летась музейны супрацоўнікі вазілі яго работы ў мастацкае вучылішча ў Віцебску, на так званыя прагляды, якія прынята праводзіць са студэнтамі мастацкіх аддзяленняў. Тады народнаму пісьменніку «выпісалі» сімвалічны дыплом, маўляў, яму прысвоена кваліфікацыя мастака. Нагул, як прызналіся арганізатары выстаўкі, яны пастараліся зрабіць яе «хатняй». Такі падыход абраны не толькі таму, што замалёўкі Быкаў рабіў для сябе, а не для шырокай публікі, пісьменнік не любіў афіцыёзных мерапрыемстваў. Засталіся яго ўспаміны пра тое, як прайшоў яго 50-гадовы юбілей у Гродне. Яго тады пасадзілі на вялікае пазалочанае крэсла з аксамітавай абіўкай. І пакуль аўтара ўхвалялі, той адчуваў сябе як вужака на патэльні, ёрзаў, то здымаў, то адзяваў акуляры. Яму больш даспадобы былі сустрэчы і гутаркі з сябрамі. Пра гэта сведчаць шматлікія фатаграфіі, размешчаныя на выстаўцы (дарэчы, у музейных фондах іх захоўваецца каля 600 адзінак). Тыя, што адбіраліся для выставачнага праекта, аб'ядналі ў стужкі, прысвечаныя пэўным тэмам, — сям'і, сяброўству, творчым сустрэчам, адпачынку. У экспазіцыі таксама падаюцца афішы да фільмаў і спектакляў, зробленых па творах Быкава.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ, фота аўтара.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
31 студзеня 2024 г. № 4 (737)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

ЯКАСНА І ЭФЕКТЫЎНА

Падрабязнасці асабістага прыёму грамадзян, які днямі правяла Наталля КАЧАНАВА

На працягу больш як дзесяці гадзін Старшыня Савета Рэспублікі размаўляла з людзьмі. Каб трапіць на прыём да спікера верхняй палаты парламента, многія з іх пераадолелі адлегласць у сотні кіламетраў. Жыхары рэгіёнаў ехалі ў Савет Рэспублікі з апошняй надзеяй: дагэтуль многія з іх беспаспяхова прайшлі шэраг інстанцый. Наталля Качанава ўважліва выслухала кожнага — у выніку прыняты канкрэтныя рашэнні, дадзены даручэнні рэспубліканскім і мясцовым органам дзяржаўнага кіравання, некаторыя пытанні спікер узяла на асабісты кантроль.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Якаснае водазабеспячэнне будзе!

Брастаўчанак Анастасію, Юлію і Ірыну прывяло ў сталіцу жыллёвае пытанне. Жанчыны паведамілі, што жывуць у эксперыментальным доме, пабудаваным у 2019 годзе для шматдзетных і сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей з інваліднасцю. Яны падзяліліся, што ў свой час былі вельмі шчаслівыя атрымаць ключы ад уласнага жылля. Аднак неўзабаве іх настрой пачаў мяняцца… Справа ў тым, што ў доме, са слоў заяўніц, вельмі дрэнная якасць вады. Нягледзячы на тое, што супрацоўнікі камунальных службаў рэгулярна праводзяць пэўныя работы, вада застаецца не прыдатнай для прыгатавання ежы і для пітця. Больш за тое, на фоне няякаснай вады псуюцца катлы, якія даводзіцца рэгулярна мяняць, выходзяць са строю пральныя машыны. Апошнім часам жыхары шматкватэрнага дома сутыкнуліся яшчэ і з праблемай ацяплення.

Наталля Качанава пацікавілася ў намесніка старшыні Брэсцкага гарвыканкама, які прысутнічаў на прыёме, навошта ўвогуле ў абласным цэнтры, дзе ёсць цэнтральнае ацяпленне, будуюць дамы з катламі. Па словах Андрэя Ільяшука, будаваць дамы менавіта з такой сістэмай водазабеспячэння эканамічна мэтазгодна — гэта практыка сябе добра зарэкамендавала. «Са свайго боку мы прапаноўваем забраць гэты дом на дзяржаўнае забеспячэнне», — дадаў ён.

Як заўважыла Старшыня Савета Рэспублікі, варта шукаць прычыну праблемы. Пры гэтым, па яе словах, не мае значэння, будзе гэты дом на балансе ЖКГ або на балансе таварыства ўласнікаў. Спікер паставіла задачу — забяспечыць якаснае ацяпленне і водазабеспячэнне жылога дома. Адпаведныя даручэнні дадзены губернатару Брэсцкай вобласці і міністру жыллёва-камунальнай гаспадаркі. «Трэба разабрацца і прыняць усе меры, каб такіх праблем у людзей не было», — рэзюмавала Наталля Качанава. Пры гэтым спікер акцэнтавала ўвагу на тым, што падобныя праблемы, па яе меркаванні, варта вырашаць на мясцовым узроўні.

Паводзіны суседа — на кантролі

Наталля Пятроўна прыехала на прыём грамадзян з Ельска. Пераадолець немалую адлегласць жанчыну прымусіў канфлікт з суседзямі. Пенсіянерка паведаміла, што на працягу доўгага часу яна жыла з імі душа ў душу. Але некалькі гадоў таму іх сваяк вызваліўся з месцаў зняволення, і адносіны паміж суседзямі пагоршыліся. Заяўніца разам са сваімі блізкімі баяцца жыць з імі побач: мужчына з турэмным мінулым пастаянна пагражае пенсіянерам, неаднаразова прымяняў фізічную сілу. Акрамя таго, жанчына паскардзілася на незаконныя прэтэнзіі з боку суседзяў да іх зямлі, наўмыснае забруджванне домаўладання нафтапрадуктамі.

«З зямельнымі пытаннямі разбяромся, — адзначыла Наталля Іванаўна. — Па пытаннях, якія датычацца камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, дадзім даручэнне міністру. Зробім усё, што ад нас залежыць».

(Заканчэнне на 8-й стар.)

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Важныя сустрэчы па актуальных нагодах

Падрабязнасці працоўнага тыдня сенатараў

● **Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ** сустрэўся са студэнтамі мінскага філіяла Беларускага гандлёва-эканамічнага ўніверсітэта спажывецкай кааперацыі. Сустрэча адбылася ў рамках дыялогавай пляцоўкі «100 пытанняў сенатару». У ходзе сустрэчы парламентарый адказаў на пытанні студэнтаў, якія датычацца адзінага дня галасавання, забеспячэння міру і бяспекі ў краіне, маладзёжнай палітыкі, палесціна-ізраільскага канфлікту, фарміравання шматпалярнага свету, сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі, выхавання патрыятызму і грамадзянскай актыўнасці моладзі. Сяргей Рачкоў таксама расказаў аб асноўных выніках дзейнасці Савета Рэспублікі ў 2023 годзе.

● **Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ** правёў асабісты прыём грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб. Да сенатара звярнуліся заяўнікі па пытаннях абскарджання судовых пастаноў, нязгоды з установленымі межамі зямельнага ўчастка, а таксама дзеяннямі службовых асоб дзяржаўных органаў і арганізацый. Сяргей Сівец патлумачыў парадак абскарджання судовых рашэнняў і дзеянняў (бяздзеяння) службовых асоб. Па асобных заявах будуць накіраваны звароты парламентарыя ў мясцовыя органы ўлады.

● **Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, старшыня РГА «Белая Русь», старшыня Беларускай партыі «Белая Русь» Алег РАМАНАЎ** прыняў удзел у пасяджэнні Рэспубліканскага Савета РГА «Белая Русь», якое прайшло ў Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі. Сярод іншых пытанняў абмяркоўваўся ўдзел рэспубліканскай грамадскай арганізацыі «Белая Русь» у выбарах дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу. «У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб грамадзянскай супольнасці» і Законам Рэспублікі Беларусь «Аб Усебеларускім народным сходзе», РГА «Белая Русь» мае права на ўзаемадзеянне з дзяржавай у асаблівых формах, гэта значыць, грамадскае аб'яднанне можа вылучаць сваіх актывістаў у якасці дэлегатаў УНС, — адзначыў сенатар. — У сувязі з чым найбліжэйшым часам будзе праводзіцца вялікая работа па вызначэнні кандыдатур, якія прадставяць грамадскае аб'яднанне. Таксама на пасяджэнні Рэспубліканскага Савета было прынята рашэнне аб скліканні пазачарговага З'езда РГА «Белая Русь», дзе афіцыйна пройдзе вылучэнне кандыдатур у якасці дэлегатаў УНС». Акрамя таго, падчас пасяджэння члены Рэспубліканскага Савета РГА «Белая Русь» зацвердзілі План мерапрыемстваў па святкаванні 80-й гадавіны вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, абмеркавалі шэраг арганізацыйных пытанняў па рэалізацыі гэтага плана.

● **Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, старшыня Гродзенскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў Віктар ЛІСКОВІЧ** прыняў удзел у дыялогавай пляцоўцы на тэму «Адзіны дзень галасавання», якая прайшла ў абласным дыспансеры спартыўнай медыцыны. Сенатар нагадаў, што ў фармаце адзінага дня галасавання ў нашай краіне выбары пройдуць упершыню. У выніку грамадзяне абяруць дэпутатаў усіх узроўняў. «Важна ў адказны перыяд правядзення выбарчай кампаніі быць разам, — падкрэсліў Віктар Лісковіч. — Усе разумеюць значнасць маючых адбыцца выбараў. Ад таго, як беларусы прагаласуюць, напрамую залежыць якасць жыцця кожнага».

Вераніка КАНЮТА.

ЯКАСНА І ЭФЕКТЫЎНА

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

Што да незаконных паводзін суседа, як запэўніў **начальнік галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі МУС Аляксандр КУПЧЭНЯ,** прадстаўнікі цэнтральнага апарату ведамства выедуць на месца і ўважліва разгледзяць зварот. «Па ўсіх фактах праводзіліся праверкі, мужчына за гэта прыцягнуты да крымінальнай адказнасці, — паведаміў палкоўнік міліцыі. — Ён стаіць на ўліку ў міліцыі. Паводзіны гэтага чалавека будуць узяты на кантроль. Разбяромся па кожным факце».

Працаваць і атрымліваць дапамогу на дзіця: ёсць выключэнні

Наталля Вітольдаўна прыехала ў Савет Рэспублікі з Гродна. Жанчына расказала, што адна выхоўвае траіх дзяцей. Знаходзячыся з малодшым у дэкрэтным адпачынку, яна на паўстаўкі дыстанцыйна працавала ў расійскай кампаніі, пры гэтым не выязджала за межы Рэспублікі Беларусь. Нашым заканадаўствам не забаронена працаваць, будучы ў дэкрэтным адпачынку: у такім выпадку той, хто знаходзіцца ў дэкрэце, можа разлічваць на 50 % ад дапамогі па доглядзе дзіцяці. Заяўніцы ў дапамозе на дзіця было адмоўлена, паколькі яна працавала ў інтарэсах іншай дзяржавы. Па прызначэнне выплаты ёй было рэкамендавана звярнуцца ў Расійскую Федэрацыю. Аднак, як высветлілася, і там, згодна з расійскім заканадаўствам, жанчына не мае права на дапамогу па доглядзе дзіцяці.

Як патлумачыў **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валерый КАВАЛЬКОЎ,** грамадзяне Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь, якія працуюць на тэрыторыі дзвюх краін, трапляюць пад дзеянне дагавора аб супрацоўніцтве ў галіне сацыяльнага забеспячэння. «Дапамога не прызначалася, пакуль вы знаходзіліся ў працоўных адносінах з Расійскай Федэрацыяй, — звярнуўся прадстаўнік ведамства да заяўніцы. — Артыкул 5 дадзенага дагавора сведчыць аб тым, што грамадзяне, якія працуюць па працоўных дагаворах, трапляюць пад заканадаўства той дзяржавы, дзе яны працуюць. Наталля Вітольдаўна, заключыўшы працоўны дагавор з Расійскай Федэрацыяй, на падставе заканадаўства гэтай краіны трапляе поўнасцю пад юрысдыкцыю Расійскай Федэрацыі. Таму прызначыць ёй дапамогу ў Рэспубліцы Беларусь мы не маглі. Пасля таго як дагавор быў скасаваны, дапамога была прызначана».

Сапраўды, з верасня мінулага года Наталля Вітольдаўна атрымлівае патрэбныя грошы, якія выплачваюцца ёй нашай дзяржавай. Аднак для гэтага яна вымушана была звольніцца з работы. Жанчына ставіць пытанне аб аднаўленні ёй нявыплачанай за 11 месяцаў дапамогі.

Наталля Качанава адзначыла, што сітуацыя патрабуе дасканалага вывучэння. «Будзем разбірацца, у выніку чаго вас праінфармуем», — паабяцала яна.

Хоча служыць, але не можа

Са сваёй бядой да Старшыні Савета Рэспублікі звярнулася жыхарка Касцюковічаў. Наталля Мікалаеўна расказала, што яе сын вучыўся ў Ваеннай акадэміі. Па пэўных прычынах ён быў адлічаны. Маладога чалавека прызвалі ў армію, пасля службы ён уладкаваўся ў Рэспубліканскі атрад спецыяльнага прызначэння «Зубр» Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. У кастрычніку мінулага года малады чалавек трапіў у рэанімацыю, пасля чаго быў устаноўлены дыягназ — цукровы дыябет 1-га тыпу. У сувязі з праблемамі са здароўем працягваць службу ў сілавых структурах сын жанчыны не можа, але вельмі гэтага жадае. Больш за тое, за навучанне ў Ваеннай акадэміі, якую ён не скончыў, грамадзянін павінен выплаціць дзяржаве немалую суму.

Як патлумачылі прадстаўнікі Міністэрства абароны, якія прысутнічалі на прыёме грамадзян, згодна з дзеючым Палажэннем аб парадку праходжання ваеннай службы, грамадзяне, якія былі адлічаны з ваенных навучальных устаноў па асобных прычынах, павінны кампенсаваць шкоду дзяржаве. Ад кампенсацыі вызваляюцца грамадзяне, якія паўторна паступаюць на службу ў сілавыя структуры, у тым ліку Следчы камітэт, органы ўнутраных спраў і МНС. Такім чынам, малады чалавек, аб якім ідзе размова, не выплачваў грошы за навучанне, бо служыў у інтарэсах Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Але, паколькі з-за стану здароўя ён вымушаны быў спыніць службу, зноў паўстала пытанне аб кампенсацыі шкоды дзяржаве.

Міністэрства абароны аператыўна зрэагавала на сітуацыю і, каб падобных выпадкаў больш не ўзнікала, працуе над папраўкамі ў Палажэнне аб парадку праходжання ваеннай службы. Як расказаў у размове з журналістамі **начальнік упраўлення прававога забеспячэння Міністэрства абароны Сяргей САУТА,** на дадзены момант ад кампенсацыі расходаў за навучанне ў ваенных ВНУ вызваляюцца грамадзяне, якія паўторна паступілі ў сілавыя структуры і на працягу пяці гадоў выконваюць свае службовыя абавязкі. Пры гэтым не ўлічваецца такая акалічнасць, як пагаршэнне стану здароўя, у сувязі з чым грамадзянін не можа працягваць службу. Плануецца ўнесці ў заканадаўства норму аб тым, што грамадзянін вызваляецца ад кампенсацыі расходаў і ў выпадку, калі падчас паўторнага праходжання службы ён захварэў або быў звольнены па хваробе.

Па словах Сяргея Сауты, унясенне гэтага змянення шчыльна пераплятаецца з законапраектам «Аб змяненні законаў па пытаннях забеспячэння нацыянальнай бяспекі». «Як толькі закон будзе прыняты, мы будзем прыводзіць у адпаведнасць з ім і адпаведны ўказ, — удакладніў ён. — Але да гэтага часу, я думаю, мы паспеем узгадніць яго з усімі дзяржорганамі і фактычна адразу ж запусцім у работу. Думаю, гэта будзе даволі хутка».

Улічваючы дыягназ сына, маці звярнулася да Старшыні Савета Рэспублікі з просьбай дапамагчы яму з працаўладкаваннем. Спікер верхняй палаты парламента паставіла задачу — падабраць маладому чалавеку работу ў сілавых структурах: тую, якую можна выконваць з улікам дыягназу. Хутчэй за ўсё, гэта будзе цывільная пасада. «Нам патрэбны такія хлопцы, тым больш яму падабаюцца сілавыя структуры», — звярнула ўвагу Наталля Качанава.

Як падзялілася пасля прыёму заяўніца, яна задаволена вынікам сваёй паездкі ў Мінск. «Вывучыўшы заканадаўства, разумела, што існуе невялікі прабел, — кажучы аб прычыне свайго звароту, патлумачыла Наталля Мікалаеўна. — Мяне запэўнілі, што карэкціроўка адпаведнага дакумента ўжо вядзецца. Магчыма, гэта спатрэбіцца не толькі нам, але і яшчэ камусьці». Жанчына падзякавала Наталлі Іванаўне за тое, што спікер паабяцала дапамагчы яе сыну з працаўладкаваннем.

Пытанні, з якімі грамадзяне падчас асабістага прыёму звярталіся да Старшыні Савета Рэспублікі, знаходзяцца ў зоне адказнасці розных службаў і ведамстваў. Людзей традыцыйна хвалюе якасць і тэрміны будаўніцтва, паляпшэнне жыллёвых умоў, добраўпарадкаванне населеных пунктаў, работа жыллёва-камунальнай гаспадаркі, працаўладкаванне, медыцынскае абслугоўванне і многае іншае. Практычна ўсе пытанні, агучаныя падчас прыёму грамадзян, з'яўляюцца прэрагатывай мясцовых органаў улады. Калі б у рэгіёнах своечасова і кампетэнтна рэагавалі на запыты людзей, не было б вялікай колькасці зваротаў у Савет Рэспублікі. Толькі ў 2023 годзе членамі верхняй палаты парламента было разгледжана каля 7,5 тысячы зваротаў. Праведзены 716 асабістых прыёмаў грамадзян, 361 прамая тэлефонная лінія, 2114 сустрэч з працоўнымі калектывамі і насельніцтвам па месцы жыхарства. І гэта работа працягваецца, бо ўзаемадзеянне з насельніцтвам — адна з прыярытэтных задач членаў Савета Рэспублікі, якую яны выконваюць якасна і эфектыўна.

Вераніка КАНЮТА.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

СКЛАД УЧАСТКОВЫХ ВЫБАРЧЫХ КАМІСІЙ

АДЗІНЫ ДЗЕНЬ ГАЛАСАВАННЯ

ДЛЯ ПРАВЯДЗЕННЯ ВЫБАРАЎ У АДЗІНЫ ДЗЕНЬ ГАЛАСАВАННЯ 25 ЛЮТАГА 2024 ГОДА Ў БЕЛАРУСІ СФАРМІРАВАНА 5411 УЧАСТКОВЫХ ВЫБАРЧЫХ КАМІСІЙ, У СКЛАД ЯКІХ УВАЙШЛІ 57 233 ЧАЛАВЕКІ

МІНЧАНАМ — ПА ДВА, ВЯСКОЎЦАМ — ПА ЧАТЫРЫ

Чым адметны адзіны дзень галасавання

Учора завяршылася рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты. Пачынаецца самы цікавы перыяд у выбарчай кампаніі — перыяд агітацыі. Ён будзе доўжыцца да 24 лютага.

Адзіны дзень галасавання адбудзецца 25 лютага. З 20 да 24 лютага тыя грамадзяне, у якіх па нейкіх прычынах не атрымліваецца прыйсці на ўчастак у асноўны дзень, могуць прагаласаваць датэрмінова. Калі выбаршчык на стане здароўя альбо па іншых уважлівых прычынах не можа прыйсці ў дзень выбараў у памяшканне для галасавання, ён можа запрасіць членаў участковай камісіі да сябе дадому. Аб жаданні прагаласаваць дома трэба паведаміць ва ўчастковую камісію ў любы час, а ў дзень выбараў — да 18 гадзін. Майце на ўвазе, што галасаванне дома магчыма толькі непасрэдна 25 лютага.

Гэтым разам колькасць бюлетэняў, якія атрымае выбаршчык, залежыць ад месца яго пражывання: жыхары сталіцы будуць выбіраць дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і дэпутатаў Мінгарсавета — ім належыць запоўніць два бюлетэні. Тыя, хто жыве ў абласным горадзе або райцэнтры, атрымаюць тры бюлетэні — ім трэба будзе выбраць дэпутата Палаты прадстаўнікоў, дэпутата абласавета, дэпутата раён(або гар-) савета. Найбольшую колькасць бюлетэняў атрымаюць вяскоўцы — акрамя ўсіх пералічаных, яны яшчэ будуць выбіраць і дэпутатаў сельсавета, а гэта ўжо чацвёрты бюлетэнь.

Выбары, якія праводзяцца такім чынам, — калі ў адзін дзень выбіраюць прадстаўнікоў заканадаўчай улады ўсіх узроўняў, — першыя ў гісторыі незалежнай Беларусі. Гэта яшчэ адна важная прычына паўдзельнічаць у сапраўды гістарычнай падзеі.

СУВЯЗЬ ПАКАЛЕННЯЎ

«НАМ ТРЭБА ЗАХАВАЦЬ СВАЮ КРАІНУ»

Аб чым Наталля КАЧАНАВА гаварыла з членамі Маладзёжнага савета пры Нацыянальным сходзе і маладзёжных саветаў пры мясцовых Саветах дэпутатаў

СТАРШЫНЯ Савета Рэспублікі ўдзяляе вялікую ўвагу рабоце з моладдзю. Аб гэтым сведчаць шматлікія сустрэчы і размовы з падрастаючым пакаленнем. Невыпадкова ў 2020 годзе пры Нацыянальным сходзе быў створаны Маладзёжны савет (парламент), які з'яўляецца галоўным праваднікам парламентарыяў у рабоце з моладдзю. У цяперашні час Маладзёжны савет прадстаўляюць 138 хлопцаў і дзяўчат з кожнага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага цэнтра нашай краіны. У маладзёжныя саветы (парламенты) пры мясцовых Саветах дэпутатаў уваходзіць 3460 маладых людзей. Найбольш актыўныя з іх былі запрошаны на сустрэчу са спікерам у Савет Рэспублікі.

Фота БелТА.

Наталля Качанава сарыентавала прысутных на эфектыўную работу з моладдзю на месцах, расказала аб прыярытэтных кірунках дзяржаўнай палітыкі, асаблівасцях заканатворчай дзейнасці. Асаблівая ўвага падчас сустрэчы была ўдзелена ключавым падзеям, да якіх рыхтуецца наша краіна: адзінага дня галасавання і фарміравання Усебеларускага народнага сходу, правядзення XI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, святкавання 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

«Мы не павінны дапусціць кровапраліцця і вайны»

Спікер верхняй палаты парламента нагадала, што створаны Рэспубліканскі аргкамітэт па падрыхтоўцы святкавання 80-й гадавіны вызвалення Беларусі і Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, і пахваліла моладзь за ўклад у захаванне памяці аб тых падзеях.

«Наша сумесная з моладдзю задача — прасоўваць міралюбівую палітыку нашай краіны, — акцэнтавала ўвагу Наталля Качанава. — Мы не павінны дапусціць кровапраліцця і вайны на нашай зямлі. Хопіць, наш народ напакутаваўся. Мы ніколі нікому не пагражалі і не будзем пагражаць, але, калі будзе патрэбна, будзем абараняць нашу краіну. Іншага нам не дадзена».

Спікер заўважыла, што сёння нікога не можа не турбаваць тое, што адбываецца на Блізкім Усходзе. «Гэты гарачы пункт можа перарасці ў такі канфлікт, што прывядзе да трэцяй сусветнай вайны, — дадала яна. — Вось чаго нельга дапусціць. Нам трэба захаваць сваю краіну, развіваць у адпаведнасці са сваімі законамі і традыцыямі, рабіць усё, каб не дапусціць ніякіх канфліктаў і канфрантацый. Ніхто нічога з намі не зробіць, калі мы будзем адзіныя ўнутры краіны».

«Трэба па-чалавечы ставіцца да людзей»

Па словах Старшыні Савета Рэспублікі, ужо пачалася падрыхтоўка беларуска-расійскага патрыятычнага, культурна-адукацыйнага праекта «Цягнік Памяці». У мінулым годзе ў «Цягніку Памяці» ехалі маладыя людзі з Беларусі і Расіі, Кыргызстана і Арменіі. Сёлета ўпершыню запрошаны школьнікі з Узбекістана і Казахстана. Плануецца, што геаграфія ўдзельнікаў будзе пашырацца. Старт праекту, як заўсёды, будзе дадзены ў горадзе Брэсце 21 чэрвеня, каб 22 чэрвеня хлопцы і дзяўчаты змаглі прыняць удзел у мерапрыемствах, прысвечаных пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Распрацоўваецца маршрут, па якім паедзе «Цягнік Памяці».

Паралельна ажыццяўляецца падрыхтоўка да XI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які пройдзе ў Віцебску, Полацку і Наваполацку. Наталля Качанава расказала, што адна з секцый будзе прысвечана маладзёжнай палітыцы. Увогуле, па яе словах, форум пройдзе пад эгідай інавацыйнага развіцця, будзе шмат цікавых пляцовак, якія пакажуць гісторыю і прыгажосць беларускіх гарадоў.

Усю гэтую інфармацыю, як заўважыла спікер, члены маладзёжных парламентаў павінны трансліраваць сярод сваіх равеснікаў. «Мы абавязаны дайсці да кожнага маладога чалавека, — сарыентавала спікер. — У гэтым наша сіла. Як і сіла любой краіны — у адзінстве народа. Гісторыя нас вучыць. Нам трэба захаваць сваю краіну — прыгожую, утульную, камфортную, дзяржаву для народа».

Наталля Качанава лічыць унікальным вопыт членаў маладзёжных саветаў, які яны атрымліваюць, назіраючы за работай старэйшых калег. «Набірацца гэтага вопыту вельмі важна, але, якую б пасаду ў далейшым вы ні займалі, перш за ўсё трэба па-чалавечы ставіцца да людзей, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі. — Гэта асноўнае! Ніколі з вас не атрымаецца добрага кіраўніка (любога рангу), калі вы не любіце людзей і дрэнна адносіцеся да іх, ставіце сябе вышэй іншых. Гэта бяда, гэта тое, чаго нельга дапускаць. Справядлівыя адносіны да людзей павінны быць асноватворным у вашай рабоце. Гэта самае галоўнае. Калі чалавек па-добраму адносіцца да людзей, ён будзе ўсё рабіць, каб ім дапамагчы».

«Выбары — святы абавязак»

Члены маладзёжных парламентаў атрымалі магчымасць задаць пытанні спікеру верхняй палаты парламента. У прыватнасці, маладыя людзі пацікавіліся, якія пажаданні Наталля Іванаўна адрасуе тым, хто ўпершыню будзе галасаваць у адзіны дзень галасавання.

Як падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі, для яе выбары заўсёды з'яўляліся святам: і ў дзяцінстве, і ў маладосці, нічога не змянілася і цяпер. «І нават думкі аб тым, каб не пайсці на выбары, не было, — заўважыла спікер. — Гэта за гранню разумення. Выбары — свята, выбарчыя ўчасткі з песнямі, танцамі, буфетамі. Усе ішлі на выбары, таму што разумелі, што гэта твой святы абавязак».

Адказваючы на пытанне аб негатыўных наступствах штучнага інтэлекту і дэструктыўным уплыве інтэрнэту на моладзь, Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла, што кібербяспека з'яўляецца адной з асноўных функцый нашай дзяржавы. Па яе словах, кожная краіна задумваецца аб тым, як абараніцца ад нападаў, якія ўздзейнічаюць на розумы людзей. Спікер лічыць, што перш за ўсё варта паставіць заслон негатыўнай інфармацыі і тым сайтам і прадуктам, якія накіраваны на разбурэнне нашай краіны. Пры гэтым Наталля Качанава падкрэсліла, што нічога ў жыцці не заменіць чалавечыя зносіны, але ж калі без інтэрнэту складана ўявіць сённяшні дзень, то трэба разумець рэаліі жыцця і ўсведамляць, дзе — хлусня, а дзе — праўда.

Маладыя людзі пацікавіліся аб магчымасці ўнесці ў школьныя падручнікі інфармацыю аб маладзёжным парламентарызме, прапанавалі павялічыць працоўны дзень для непаўналетняй моладзі, якая працуе ў студатрадах. Акрамя таго, членаў маладзёжных парламентаў хвалюе пытанне замацаванасці маладых спецыялістаў у рэгіёнах, будаўніцтва жылля для ваеннаслужачых і інш.

Вераніка КАНЮТА.

У тэму

Намеснік старшыні камісіі па пытаннях навукі і адукацыі Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Павел ЛАПАЦІНСКІ:

— Сустрэча з Наталляй Іванаўнай — вялікая падзея для членаў маладзёжных парламентаў. Гэта дзве з паловай гадзіны канструктыўнага, шчырага дыялогу. Вельмі важныя пасылы, якія спікер абазначыла членам маладзёжных парламентаў, несумненна, будуць прыменены ў рабоце. Усе даручэнні, якія мы атрымалі, упэўнены, будуць паспяхова выкананы. Пытанні, якія ўздымалі члены маладзёжных парламентаў на сустрэчы, — гэта і захаванне гістарычнай памяці, што сёння немалаважна, і геапалітычная абстаноўка вакол нашай краіны напярэдадні электаральнай кампаніі, і ў цэлым электаральная кампанія, да якой мы так актыўна рыхтуемся, гэта і ўдзел моладзі ў гэтым працэсе. Члены маладзёжных парламентаў, несумненна, павінны пайсці ў працоўныя калектывы і трансліраваць той парадак дня, які нам удалося сёння пачуць, той, які гучыць з вуснаў кіраўніка дзяржавы.

У тэму

Старшыня Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Мікіта РАЧЫЛОЎСКІ:

— Моладзь актыўна ўключылася ў электаральную кампанію. 44 прадстаўнікі Маладзёжнага парламента балатуюцца ў мясцовыя саветы дэпутатаў, чатыры чалавекі — у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Гэта вельмі добры вынік, улічваючы, што сярэдні ўзрост членаў Маладзёжнага парламента — 26 гадоў. Гэта працоўная моладзь. 2020 год нас навучыў, моладзь стала больш падкаваная, эрудыцыя і кругагляд сталі куды больш шырокімі. Маладыя людзі развіваюцца, атрымліваюць неабходныя навыкі, кампетэнцыі і ўменні для таго, каб быць паўнавартаснымі грамадзянамі, грамадскімі лідарамі і прадстаўляць дзяржаўную маладзёжную палітыку ў розных галінах.

Сацыяльны, эканамічны, экалагічны эфект

Ад ідэі да ўвасаблення ў жыццё

НА Гомельшчыне 11 праектаў грамадзянскіх ініцыятыў атрымаюць фінансавую падтрымку і будуць рэалізаваны ў найбліжэйшы час.

У рэгіёне сталі вядомы праекты — пераможцы адкрытага конкурсу грамадзянскіх ініцыятыў Гомельскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў. Першы такі конкурс быў праведзены ў вобласці ў 2022 годзе. Тады для ўдзелу ў адборы свае праекты прапанавалі прадстаўнікі розных раёнаў. Пераможцамі былі прызнаны 16 праектаў, рэалізаваных пры фінансавай падтрымцы Банка развіцця.

У мінулым годзе на Гомельшчыне адкрыты конкурсны адбор ідэй і ініцыятыў ад грамадзян быў аб'яўлены ўпершыню з улікам уключэння прававога інстытута грамадзянскіх ініцыятыў у Закон «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь». Як вядома, ініцыятарамі рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў могуць выступаць грамадзяне, якія дасягнулі 18-гадовага ўзросту і пастаянна пражываюць на тэрыторыі адпаведнай тэрытарыяльна-адміністрацыйнай адзінкі. У разліку сродкаў, неабходных для рэалізацыі грамадзянскай ініцыятывы, не менш як дзесяць працэнтаў уносіцца за кошт ініцыятара праекта.

Па выніках папярэдняга разгляду праектаў Гомельскім абласным Саветам дэпутатаў прынята рашэнне аб іх накіраванні ў абласную асацыяцыю мясцовых Саветаў дэпутатаў для далейшай ацэнкі.

Як патлумачыла **дырэктар Гомельскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў Лілія ШАХЛЯНКОВА,** сходам асацыяцыі створана камісія па правядзенні адкрытага конкурснага адбору праектаў грамадзянскіх ініцыятыў, вызначаны рэгламент яе работы.

— У склад конкурснай камісіі ўвайшлі прадстаўнікі асацыяцыі, Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў, Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта, — адзначыла Лілія Шахлянкова.

У выніку папярэдняга разгляду праектаў грамадзянскіх ініцыятыў у Гомельскім абласным Савеце дэпутатаў да конкурснага адбору ў Гомельскую абласную асацыяцыю мясцовых Саветаў дэпутатаў дапушчаны 54 праекты грамадзянскіх ініцыятыў.

— Пераможцамі вызначаны 11 праектаў. Яны атрымаюць фінансавую падтрымку на ажыццяўленне, — дадала дырэктар Гомельскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў.

Як звярнула ўвагу **старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў і старшыня праўлення Гомельскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў Вікторыя ЛАДУЦЬКА,** конкурс праектаў накіраваны ў першую чаргу на стымуляванне грамадзянскіх ініцыятыў і вырашэнне сацыяльна значных пытанняў у раёнах, у тым ліку ў аддаленых сельскіх населеных пунктах.

Сярод пераможцаў адкрытага конкурснага адбору грамадзянскіх ініцыятыў, якія рэалізуюць у бягучым годзе, — праекты, прадстаўленыя ад Гомельскага, Брагінскага, Кармянскага, Ельскага, Рагачоўскага, Чачэрскага, Мазырскага, Хойніцкага раёнаў і горада Нароўлі. У ліку пераможцаў адразу два праекты, якія рэалізуюць на тэрыторыі Жыткавіцкага раёна.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Навучыцца быць грамадзянінам

Сенатар Алег ДЗЯЧЭНКА расказаў асіповіцкім школьнікам пра экстрэмізм

У Магілёўскай вобласці працягваюцца сустрэчы навучэнскай моладзі са спікерамі з ліку парламентарыяў, грамадскіх дзеячаў, ветэранаў у фармаце ШАГ (школа актыўнага грамадзяніна). На гэты раз яна адбылася ў сценах асіповіцкай сярэдняй школы № 1. Яе ўдзельнікамі сталі вучні старшых класаў. Перад імі выступіў намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Алег Дзячэнка.

Напачатку размовы сенатар прапанаваў сваім слухачам самім сфармуляваць, што азначае слова экстрэмізм і якія яно выклікае асацыяцыі. Прагучалі меркаванні, што гэта небяспека, прыхільнасць да радыкалізму, крайніх метадаў дзеяння.

— А ў вашым жыцці прысутнічае экстрым? — пацікавіўся спікер. — Напрыклад, зняць для сацыяльных сетак які-небудзь здымак, каб займець як мага больш лайкаў?

Пытанне выклікала ў зале гоман. Які ж малады чалавек не жадае папулярнасці? Але ж хапае прыкладаў, калі спроба зрабіць экстрэмальнае фота заканчваецца трагічна.

— Балансіроўка на краі заўсёды вельмі небяспечная, — аргументаваў Алег Дзячэнка. — Экстрэмізм можа быць у розных сферах — рэлігійнай, палітычнай, сацыяльнай, этнічнай. І ў кожнага свае метады, свае інструменты дасягнення эпатажнасці. Сэнс у тым, што яны крайнія. Палітычны экстрэмізм, напрыклад, пераследуе мэты разгайдаць палітычны лад. І дзейнічаюць радыкалы шляхам парушэння заканадаўства.

Сенатар нагадаў, што Беларусь шматнацыянальная краіна. У ёй пражывае каля 130 народнасцяў і нацыянальнасцяў. І ўсе яны суіснуюць у міры і сяброўстве. Гэта наш нацыянальны брэнд.

— Сутыкаць паміж сабой народы, гэта і ёсць экстрэмізм, — падкрэсліў ён. — Нацыянальныя і рэлігійныя пачуцці самыя найглыбейшыя. Мэта рэлігійнага экстрэмізму парушыць міжканфесійны і грамадзянскі мір і згоду, падарваць дзяржаўную бяспеку і тым самым разбурыць нацыянальную згоду краіны.

Выступоўца падзяліўся сваімі разважаннямі наконт парламенцкіх выбараў у Сербіі, дзе ён прысутнічаў у якасці міжнароднага назіральніка.

— Я бачыў тыя сілы, якія разгойдвалі там абстаноўку, фінансавалі незадаволеных, падбухторвалі на радыкальныя дзеянні, — паведаміў ён.

Небяспека крыецца ў тым, што экстрэмісцкія ідэі распаўсюджваюцца ў тым ліку і праз сацыяльныя сеткі. Аднаму нешта спадабалася, ён лайкнуў, звярнуў увагу на пост сваіх сяброў. І гэтак далей па ланцужку. Потым высвятляецца, што інфармацыя была экстрэмісцкай і забаронена для распаўсюджвання.

— Ты ўжо і не памятаеш, што лайкнуў, а гэта было злачынства, — аргументаваў дакладчык. — Рэпост ужо расцэньваецца як распаўсюджванне. Справаказаваць можа хто заўгодна, але заўсёды ў сеціве застаецца след. У мабільніку ўсё празрыста. І прыйдзецца адказваць перад законам.

Сенатар параіў слухачам быць больш разважлівымі і пільнымі.

— У кожнай масавай бязладзіцы ёсць рэжысёр і свае правілы гульні, — удакладніў ён. — Ёсць вонкавыя экстрэмісцкія пагрозы і ўнутраныя. Тыя ж тэрарыстычныя акты для падрыву абстаноўкі ўнутры. Распаўсюджванне экстрэмісцкіх ідэй ідзе праз «Тэлеграм», «Цік-ток», іншыя сацсеткі. Тыя, хто жадаюць разваліць краіну,актыўна дзейнічаюць у тым ліку і праз месенджары.

Спікер паведаміў таксама, якія ў краіне выпрацаваны меры супрацьдзеяння экстрэмізму, якая існуе адказнасць.

— Каб быць паспяховымі, трэба добра вучыцца і развівацца, — падкрэсліў ён. — І нельга дапускаць таго, каб быць уцягнутымі ў сумнеўныя гульні. Іншымі словамі, трэба навучыцца быць годнымі грамадзянамі нашай краіны, сапраўднымі патрыётамі.

— Каштоўнасць праекта «Школа актыўнага грамадзяніна», які існуе ў краіне ўжо не першы год, садзейнічаць палітычнай сацыялізацыі маладых грамадзян, — рэзюмаваў Алег Дзячэнка. — У рамках праекта арганізуюцца сустрэчы з вядомымі палітычнымі, грамадскімі дзеячамі, ветэранамі вайны і працы. Для моладзі вельмі важна падсілкоўвацца ідэямі, якія садзейнічаюць выхаванню патрыятызму, пачуцця высокай грамадзянскай адказнасці, знаёмству з палітычнымі і гістарычнымі традыцыямі беларускага народа. Тэма экстрэмізму была абрана невыпадкова. Апошнім часам узрастае яго праяўленне ў маладзёжным асяроддзі. Таму мэтазгодна як мага часцей праводзіць такія сустрэчы з навучэнцамі, каб дэталёва пазнаёміць са зместам законаў аб супрацьдзеянні экстрэмізму і аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму, якія былі прынятыя парламентам і ўступілі ў юрыдычную сілу ў 2021 годзе. Мы расказваем навучэнцам на канкрэтных прыкладах пра формы і метады дэструктыўнага ўздзеяння на іх свядомасць з боку інфармацыйных рэсурсаў, якія размешчаны ў глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт, паказваем, што сёння з'яўляецца ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам экстрэмізмам, паказваем яго прыкметы і на канкрэтных прыкладах ілюструем, як гэта можа праявіцца ў іх жыцці.

Нэлі ЗІГУЛЯ,
фота аўтара.

г. Асіповічы.

ЧАМУ ВАЖНА СТАВІЦЬ АМБІЦЫЙНЫЯ ПЛАНЫ

Дыялог з маладымі выбаршчыкамі прайшоў у Дзятлаве

ПАДЧАС дыскусійнага форуму былі закрануты пытанні развіцця прававой і палітычнай культуры маладога пакалення, асаблівасці электаральнай кампаніі — 2024. Маладыя людзі таксама цікавіліся, якім чынам яны могуць далучыцца да дэпутацка-парламенцкай дзейнасці і наогул стаць паспяховымі.

Экспертамі дыялогавай пляцоўкі выступілі **старшыня Дзятлаўскага раённага Савета дэпутатаў Аляксандр Бараноўскі, начальнік аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі райвыканкама Вольга Рагачова, старшыня Маладзёжнага парламента пры Дзятлаўскім раённым Савеце дэпутатаў, член Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь Вікторыя ТЫЦЬ,** першы сакратар раённага камітэта ГА «БРСМ» Кацярына Хілімончык.

У сустрэчы прынялі ўдзел члены вучнёўскага Маладзёжнага парламента пры Дзятлаўскім райсавеце, а таксама члены парламента з ліку працоўнай моладзі. Вікторыя Тыць нагадала, што галоўная задача актывістаў — далучыць падрастаючае пакаленне да палітычнага жыцця краіны, садзейнічаць пераемнасці пакаленняў, абмену вопытам, пры гэтым і самім пастаянна развівацца, быць прыкладам актыўнай грамадзянскай пазіцыі.

— Што ў гэтым сэнсе важна памятаць? — ставіць пытанне Вікторыя Тыць. — Гэта тое, што Маладзёжны парламент выконвае важную ролю. Гэта не проста фармальны дадатак да беларускага парламента, а паўнавартасны кансультатыўна-дарадчы орган пры Нацыянальным сходзе Беларусі. Моладзь таксама можа ўносіць свае прапановы і нават рабіць папраўкі ў законапраекты, і такая работа вядзецца. Найбольшую актыўнасць члены Маладзёжнага парламента праяўляюць у галіне маладзёжнай палітыкі, і да іх ідэй прыслухоўваюцца.

Малады парламентарый прыгадала, што іх часцей запрашаюць і на пасяджэнні Савета Рэспублікі. Асабліва калі гаворка ідзе аб найбольш важных працэсах, якія адбываюцца ў краіне. Напрыклад, падрыхтоўка да электаральных кампаній альбо распрацоўка заканадаўчых праектаў па злабадзённых аспектах.

Фота dzatlovonews.by.

— Маладзёжны парламент быў задуманы для далучэння моладзі да палітычнага жыцця краіны. Але для таго, каб зрабіць правільны выбар, патрэбныя веды. Гэта наш галоўны рэсурс. І наша задача — несці праграму нашага Маладзёжнага парламента ў кожны канкрэтны раён, — зазначае Вікторыя.

А яшчэ яна паведаміла аб раённым праекце, які ажыццяўляюць члены Маладзёжнага парламента сумесна з вучнямі Наваельнянскай сярэдняй школы «Генацыд — наша памяць і боль». На аснове матэрыялу, які захоўваецца ў школьным музеі, мяркуецца выдаць зборнік «Мінулых год жывая памяць», які раскажа аб лагеры, што быў створаны тут пасля вайны для дзяцей-сірот.

— Я лічу, што мы павінны ведаць нашу сапраўдную гісторыю, хоць нам і імкнуцца навязаць іншыя каштоўнасці. Наша задача — захаваць гэту праўду, — упэўнена кажа лідар Маладзёжнага парламента раёна.

Расказала Вікторыя і аб сустрэчах са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай. Такія размовы, на думку дзятлаўчанкі, прыдаюць рабоце маладых парламентарыяў новы імпульс. Як правіла, здымаюцца многія пытанні. Наогул, размовы са старэйшымі прадстаўнікамі дэпутацкага корпуса дапамагаюць не толькі зрабіць правільны выбар, але і рухацца далей на карысць развіцця краіны, упэўнена Вікторыя. Але тут ёсць адна ўмова — моладзі варта быць больш актыўнай. Гэта значыць, што ў жыцці трэба ставіць амбіцыйныя задачы. А каб іх дасягнуць, неабходна старанна вучыцца і добра працаваць.

— Для вучняў гэта — паступіць у ВНУ, атрымаць прэстыжную прафесію, старанна вучыцца, папаўняць кругагляд, самаўдасканальвацца, — дае свой наказ старшыня райсавета Аляксандр Бараноўскі. — Працоўнай моладзі — трэба быць актыўнымі на сваіх месцах, каб заўважылі, уключылі ў рэестр кіруючых кадраў. Усё гэта садзейнічае кар'ернаму росту. Калі з такой пазіцыі разглядаць палітычную дзейнасць і выбары, то гэта форма ўдзелу дарослых грамадзян Беларусі ў кіраванні дзяржавай. Мы выбіраем людзей, якія будуць прымаць рашэнні, ад якіх будзе залежыць і наша з вамі жыццё, і жыццё краіны ў цэлым. Маладзёжны парламент таксама скіраваны на тое, каб актывізаваць маладых людзей, каб яны ўключаліся ў палітычнае жыццё, раслі годнымі грамадзянамі сваёй Айчыны і ў далейшым праслаўлялі і развівалі яе.

Дыялог закрануў аспекты прававой і палітычнай адукаванасці. Маладым удзельнікам форуму патлумачылі, што варта не толькі ведаць законы сваёй краіны, але і ўмець правільна выкарыстоўваць іх на практыцы. І ў гэтым таксама важная роля адводзіцца маладзёжнаму парламентарызму.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by **(для зваротаў):** zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 3820000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 12.292. **Нумар падпісаны ў 19.30 30 студзеня 2024 года.**

СТАРАЯ ПАШТОЎКА — КРЫНІЦА ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ

З Санкт-Пецярбурга прыйшло паведамленне. Прысуджаны прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва за 2023—2024 гады. Адпаведнае рашэнне прынята на пасяджэнні Вышэйшага дзяржаўнага савета. Прэмія прысуджана аўтарскаму калектыву ў складзе галоўнага архітэктара «Белдзяржпраекта» Віктара Скробата, мастака-манументаліста, члена Беларускага саюза мастакоў Андрэя Пяткевіча, дырэктара Нацыянальнага гістарычнага музея Аляксандра Храмога — за стварэнне музея ў Дзяржаўным мемарыяльным комплексе «Хатынь». Лаўрэатам прэміі Саюзнай дзяржавы стаў таксама пазаштатны аўтар Выдавецкага дома «Звязда» Уладзімір Ліхадзедаў за стварэнне і рэалізацыю гісторыка-асветніцкага праекта «Бацькаўшчына», выданне аўтарскіх кніг-альбомаў у серыі «У пошуках страчанага». Прэмія прысуджана генеральнаму дырэктару навукова-творчай установы культуры Краснадарскага краю «Кубанскі казачы хор» Віктару Захарчанка за стварэнне цыкла песень «Беларусь», «Русь», «Цераз рэчаньку».

Віншуючы ўсіх лаўрэатаў, сёння мы расказваем пра плён працы Уладзіміра Ліхадзедава — члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, які даўно і настойліва займаецца прапагандай гістарычнай памяці нашай Айчыны, выкарыстоўваючы пры гэтым уласны багаты збор ілюстрацыйнага матэрыялу, найперш — старых паштовак, выдадзеных у Расійскай імперыі, а таксама ў іншых краінах свету напрыканцы XIX — у першыя дзесяцігоддзі XX стагоддзя.

У першай палове 2004 года на старонках газеты «СБ. Беларусь сегодня» з'явілася рубрыка «У пошуках страчанага». Адзін раз на тыдзень галоўная грамадска-палітычная газета краіны друкавала выявы рэпрадукцый, прысвечаных розным мясцінам нашай краіны, а таксама блізкім да Беларусі рэгіёнам. Старыя паштоўкі, прадастаўленыя Уладзімірам Ліхадзедавым, суправаджаліся тэкстамі журналістаў, пазаштатных аўтараў выдання, а таксама тэкстамі самога калекцыянера. Літаральна ўся краіна зацікавілася нечаканымі і невядомымі ў большасці выпадкаў матэрыяламі. Старонкі газеты з публікацыямі «У пошуках страчанага» пачалі выразаць, збіраць у папкі, выкарыстоўваць на ўроках і гадзінах выхаваўчай работы ў агульнаадукацыйных школах. З розных мясцін, а газету чыталі і чытаюць па ўсёй краіне, пачалі ісці запатрабаванні аб выданні публікацый і перш-наперш рэпрадукцый асобнымі кнігамі. А праца Уладзіміра Ліхадзедава ў газеце і праца яго калег па «СБ. Беларусь» была адзначана высокай узнагародай — прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне».

Плёнам даследчыцкіх і збіральніцкіх вышукаў калекцыянера і гісторыка, краязнаўца зацікавіліся музеі, розныя асветніцкія ўстановы. У розных гарадах з'явіліся пастаянна дзеючыя выстаўкі — як прыклад: Жыровічы, Мар'іна Горка, Полацк... Старыя паштоўкі — з тлумачэннямі, каментарыямі іх дасведчанага збіральніка — пачалі падарожнічаць па Беларусі, расказваць пра нашу гісторыю. Уладзімір Ліхадзедаў супольна з Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны стаў ініцыятарам шэрагу канферэнцый, круглых сталоў, на якія запрашаў у Беларусь і паплечнікаў па філакартычным захапленні. Найперш — з Расійскай Федэрацыі. Кожнае з такіх мерапрыемстваў суправаджалася выстаўкай, прадстаўленнем новых знаходак калекцыянера.

З часам публікацыі па матэрыялах калекцыі Уладзіміра Аляксеевіча пачалі з'яўляцца на старонках газеты «Голас Радзімы» — цыкл «Знічкі Айчыны», які праз некаторы час быў адзначаны прэміяй Беларускага саюза журналістаў «Залатое пяро», а таксама ў часопісе «Маладосць», урадавай і парламенцкай газеце «Звязда».

Пачалі выходзіць і кнігі серыі «У пошуках страчанага». Адно з выданняў так і называлася — «У пошуках страчанага» (выдавецтва «Літаратура і мастацтва», 2007 год). Як правіла, філакартычныя альбомы выходзілі накладамі ад 1000 да 3000 экзэмпляраў і даволі шырока разыходзіліся не толькі па Беларусі, — станавіліся ўпрыгожаннем беларускай экспазіцыі на кніжных выстаўках-кірмашах у Маскве і Пекіне, Вільнюсе і Варшаве, Празе і Львове, Кіеве і Алматы... Неаднойчы альбомы серыі былі адзначаны на рэспубліканскім конкурсе «Мастацтва кнігі», а таксама на конкурсе «Мастацтва кнігі СНД».

Своеасаблівае новае дыханне праекту надаў удзел у пашырэнні ініцыятыў Уладзіміра Ліхадзедава Міністэрства інфармацыі нашай краіны. Цяпер пад назвай «Бацькаўшчына» выстаўкі калекцыянера, яго новыя філакартычныя альбомы, а таксама дэманстрацыя магчымасцяў друку па сучасных тэхналогіях — у праграме Дня беларускага пісьменства ў розных гарадах Беларусі, у праграме традыцыйнай штогадовай Мінскай міжнароднай выстаўкі-кірмашу. «Бацькаўшчына» — твар, неад'емная частка гэтых важных дзяржаўных свят. І ў глыбінцы, правінцыі, і ў сталіцы ідуць літаральна «на Ліхадзедава», ідуць кніжнікі, проста цікаўныя да гісторыі людзі.

...А ў Выдавецкім доме «Звязда» за гады супрацоўніцтва з калекцыянерам, аўтарам выйшла больш дзесяці філакартычных альбомаў Уладзіміра Ліхадзедава: «У пошуках страчанага», «Знічкі Айчыны», «Блакада», «Місія міласэрнасці», «Мінск. Падарожжа ў часе», «Палігон. Гісторыя Скобелеўскага лагера», «Беларусь. 1914—1918. Вайна і мір», «Гродна. Падарожжа ў часе», «Слонім. Падарожжа ў часе», «75 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне», «17 верасня. Дзень народнага адзінства», «Адзінства непераможнага народа», «Ад Віцебска да Полацка: падарожжа ў часе»... Пра кожнае з гэтых выданняў шырока пісалі ў друку. Кнігі са старымі паштоўкамі Уладзіміра Ліхадзедава ёсць ва ўсіх бібліятэках Беларусі.

...Многія праекты Уладзіміра Ліхадзедава даволі цесна звязаны з гісторыяй, краязнаўствам Расіі. Гэта датычыцца і публікацый у перыёдыцы ў рамках праектаў «У пошуках страчанага», «Бацькаўшчына». Гэта датычыцца і выдання філакартычных альбомаў на тыя ці іншыя тэмы. Па-першае, калекцыянер, літаратар цесна звязаны з праваслаўным краязнаўствам. Падзеяй у крыніцазнаўстве, гістарыяграфіі стаў выпуск альбома, прысвечанага біяграфіі Аляксандра Неўскага. Уладзімір Аляксеевіч сабраў разам выявы старых паштовак з адлюстраваннем праваслаўных храмаў, якія носяць імя Святога Аляксандра Неўскага. Асобнае месца ў творчай, даследчыцкай працы лаўрэата занялі клопаты па збіранні альбома «Блакада». Гэта ўвогуле ўнікальная праца, роўных, аналагічных якой у багатай літаратуры, прысвечанай блакадзе Ленінграда ў Вялікую Айчынную вайну, проста не існуе.

Віцебск. Успенскі сабор. Пачатак XX стагоддзя.



Ашмяны. Царква (1916 год).

Бітва каля Клясціц. 31 ліпеня 1812 года. Паштоўка пачатку XX стагоддзя па карціне П. Геса.

Кастусь ЛЕШНІЦА.
На здымках: Уладзімір Ліхадзедаў – жаданы госць на кніжных выстаўках; старыя паштоўкі з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава з кніг, якія выйшлі ў Выдавецкім доме «Звязда».

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by
Продавец	ОАО «Сбер Банк», 220030, г. Минск, пр-т Независимости, 32А-1
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46, www.ipmtorgi.by

Предмет электронных торгов

Капитальное строение, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Мозырь, ул. Ленинская, 2	Начальная цена с НДС 20 %
Здание банка (здание административно-хозяйственное) общей площадью 2479 кв. м, инвентарный номер 330/С-11218. Составные части и принадлежности: подвал, крыльцо. **Дополнительная информация:** при приобретении предмета аукциона, победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи имущества, относящегося к предмету аукциона, на сумму **11691,39 белорусского рубля с НДС 20 %**. Состав имущества и цены размещены на сайте организатора аукциона www.cpo.by и www.ipmtorgi.by	**1 236 452,40 бел. руб.**

Сведения о земельном участке с кадастровым номером 341500000001000141: назначение – строительство и обслуживание здания отделения ОАО «Белпромстройбанк», предоставлен на праве постоянного пользования общей площадью 0,1636 га

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ» г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»**

Срок подписания договора купли-продажи: 10 рабочих дней после электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов: не более 30 дней со дня заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **0,7 %** от цены продажи лота

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 31.08.2023 г.

Дата и время начала и окончания электронных торгов	**Начало торгов: 10.00 15.02.2024. Окончание торгов: 12.00 15.02.2024.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 14.02.2024 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by
Контактные данные	**Тел.: +375 17-310-36-37; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ
• Взыскание задолженности
• Проведение торгов
• Ликвидация
• Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ ПОВТОРНЫХ ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

Аукцион состоится **12.02.2024,** начало: 10.00, окончание: 16.00 на электронной торговой площадке (далее – ЭТП) iintorgi.by. Время приема заявок: **с 31.01.2024 09.00 по 09.02.2024 г. 16.00**

Организатор аукциона: ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н, iin.by, iintorgi.by

Продавец: ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29

Лот № 1: имущество СПА-салона,

состоящее из 33 единиц, бывшее в употреблении.
Начальная цена с учетом НДС 20 % – 5 553,00 бел. руб.
Минимальная цена – 3 331,80 бел. руб.
Размер задатка – 10 % от начальной цены лота.
Шаг торгов – 5 % от начальной цены лота.

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия и порядок проведения аукциона, информация об имуществе, входящем в состав лота, размещены на официальном сайте ЭТП «Индустрия Инноваций – Торги» https://iintorgi.by.

Задаток перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – ООО «Индустрия Инноваций».

Контакты: тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by

ВНИМАНИЮ ПРЕДПРИЯТИЙ, ОРГАНИЗАЦИЙ И ИНДИВИДУАЛЬНЫХ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЕЙ!

Комитетом государственного имущества Гродненского областного исполнительного комитета проводятся аукционы по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Волковысского района

К ПРОДАЖЕ ПРЕДЛАГАЮТСЯ:

1) Объекты бывшего в/г, комплекс № 4: бытовой домик АЭР, склад НЗ с подвалом и боксом на 10 м/м, мощение, гараж техники с котельной, площадкой; контрольно-технический пункт парка АЭР, водопроводная сеть, около г. п. Россь Росского с/с, 39, 39/1-39/3, Волковысского района.

Начальная цена предмета аукциона – 5 базовых величин.
Размер задатка – 1 базовая величина.

2) Объекты бывшего в/г, комплекс № 11: медпункт, два здания штаба с пристройкой, объекты благоустройства по ул. Красноармейской, 51, 51/1, 51/2, в г. п. Россь Росского с/с Волковысского района.

Начальная цена предмета аукциона – 7 базовых величин.
Размер задатка – 1 базовая величина.

Аукцион состоится – **20.02.2024 г. в 11.30.**
Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.
Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **14.02.2024 г. до 16.00**.

Подробная информация по телефонам:
в городе Волковыске: 8 (01512) 5 13 44, 2 06 03;
в городе Гродно: 8 (0152) 62 39 24, 62 39 32, 62 39 23.
Дополнительная информация размещена на сайте: https://au.nca.by

УНП 500042135

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ
• Взыскание задолженности
• Проведение торгов
• Ликвидация
• Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

Организатор публичных торгов (аукциона)	ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by
Продавец	ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29

Предмет публичных торгов (аукциона)

Лот №	Наименование	Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС	Минимальная цена, бел. руб. с учетом НДС
1	Изолированное помещение (наименование: **клуб,** назначение: помещение культурно-просветительного и (или) зрелищного назначения), инвентарный номер: 710/D-88907, адрес: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102/11-1, общая площадь 919,2 кв. м)	149 590,00	119 672,00

Задаток 10 % от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»**

Шаг электронных торгов – 5 % от начальной цены лота. В случае отсутствия ставок участников торгов начальная цена торгов поэтапно снижается равными долями 5 (пять) раз до минимальной цены или до момента совершения ставок участниками торгов

Информация об имуществе, входящем в состав лота, условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги» https://iintorgi.by

Срок подписания договора купли-продажи: не позднее 10 (десяти) рабочих дней после публичных торгов (аукциона)

Условия оплаты предмета электронных торгов: не позднее 30 (тридцати) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи. Переход права собственности – после полной оплаты Имущества

Торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги», размещенном по адресу: https://iintorgi.by

Победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить аукционисту торгов вознаграждение в размере **0,7 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней** после проведения публичных торгов (аукциона)

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

Дата и время проведения торгов (аукциона): 01.03.2024, начало торгов: 10.00, окончание торгов: 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов. Заявки на участие в публичных торгах (аукционе) принимаются по 29.02.2024 г. до 17.00

Контактные данные	**Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Слуцкий сыродельный комбинат» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже одним лотом

КОМПЛЕКСА ЗДАНИЙ, СООРУЖЕНИЙ И ОБОРУДОВАНИЯ

Узденского производственного участка ОАО «Слуцкий сыродельный комбинат»,

расположенных по адресу: Минская область, Узденский район, г. Узда, пер. Колхозный, 13 в следующем составе:

№ п/п	Наименование
	Здания и сооружения
1	Главный производственный корпус, площадь 3 592,8 кв. м, инв. № 623/С-1096 (составные части и принадлежности: теневой навес, пристройка – 4 шт., навес, забор)
2	Гаражи, площадь 614,6 кв. м, инв. № 623/С-1097 (составные части и принадлежности: пристройка – 3 шт.)
3	Здание котельной, площадь 332,2 кв. м, инв. № 623/С-1098 (составные части и принадлежности: пристройка – 2 шт.)
4	Здание для мойки мусорных контейнеров, площадь 14 кв. м, инв. № 623/С-60710 (составные части и принадлежности: площадка для мусора)
5	Проходная, площадь 20,2 кв. м, инв. № 623/С-60709
6	Дезбарьер, инв. № 623/С60711 (составные части и принадлежности: площадка)
7	Градирня (инв. № 000006У), площадь 42 кв. м, инв. № 623/С-60941
8	Водонапорная башня (инв. № 000004У), высота 21,15 м, площадь 10,6 кв. м, инв. № 623/С-60930
9	Противопожарная емкость, площадь 44 кв. м, инв. № 623/С-60931
10	Противопожарная емкость, площадь 30 кв. м, инв. № 623/С-60932
11	Артскважина, инв. № 623/С-60951 (инвентарный номер 000011У) (составные части и принадлежности: павильон для пульта управления)
12	Артскважина, инв. № 623/С-60952 (инвентарный номер 000012У) (составные части и принадлежности: павильон для пульта управления)
13	Артскважина, инв. № 623/С-60953 (инвентарный номер 000013У) (составные части и принадлежности: павильон для пульта управления)
14	Линия ЛЭС, протяженность 793,3 м, инв. № 623/С-60940
15	Площадные сети канализации, протяженность 515,9 м, инв. № 623/С-60939
16	Площадные сети водопровода, протяженность 668,2 м, инв. № 623/С-60938

№ п/п	Наименование
	Оборудование
17	Котел паровой Е-1.0-09-ГЗ, 1992 г. в., заводской № 13051, рег. № 25-21-836, инв. № 000185У
18	Котел паровой с газовой горелкой: - котел паровой стальной КП-4.0-0.9, 2012 г. в., зав. № 37, рег. № 25-21-0838; - горелка газовая ГБГ-3.5-0.5, зав. № 180, инв. № 000456У
19	Система учета газа в комплекте, инв. № 000457У
20	Система водоподготовки в комплекте с автоматикой, инв. № 000455У
21	Подогреватель-теплообменник, размеры: 3,5*0,3 м, инв. № 000066У
22	Подогреватель-теплообменник, размеры: 3,5*0,3 м, инв. № 000067У
23	Горелка газовая блочная ГБ-0.85-0.1 (к котлу Е-1.0-09ГЗ), инв. № 000501У
24	Горелка газовая блочная ГБ-0.85-0.1 (к котлу Е-1.0-09ГЗ), инв. № 000502У
25	ГРУ котельной (газорегулирующая установка), инв. № 000271У
26	Резервуар для хранения молока из нержавеющей стали, двустенный, объем V=50 куб. м, инв. № 000375У
27	Резервуар для хранения молока из нержавеющей стали, одностенный, объем V=5 куб. м, инв. № 003424
28	Резервуар РВ-5 из нержавеющей стали одностенный объем V=5 куб. м, инв. № 991001245
29	Точка доступа ISCO-802/11a: автоматическая система контроля и учета электроэнергии (АСКУЭ), инв. № 000485У
30	Весы платформенные электронные НПВ=5000 кг, с индикатором весоизмерительным Newton NT-200A, инв. № 000332У
31	Весы платформенные электронные НПВ=5000 кг с индикатором весоизмерительным CAS СИ-2001А, инв. № 000428У
32	Емкость для хранения молока: из нержавеющей стали, одностенная, объем V=5 куб. м, инв. № 000316У
33	Агрегат электронасосный ЭЦВ 6-6.5-120, инв. № 000019У
34	Резервуар Я1-ОСВ-4 (для хранения сливок): из нержавеющей стали, двустенный, объем V=4 куб. м, инв. № 000161У
35	Резервуар Я1-ОСВ-6 (для хранения сыворотки): из нержавеющей стали, двустенный, объем V=6 куб. м, инв. № 000265У
36	Резервуар Я1-ОСВ-6 (для хранения сыворотки): из нержавеющей стали, двустенный, объем V=6 куб. м, инв. № 000266У

Объекты недвижимости **№№ 1–10, 15** расположены на земельном участке с кадастровым номером **625650100005000060** *(право постоянного пользования, площадь 2,0535 га)* по адресу: Минская обл., Узденский р-н, г. Узда, пер. Колхозный, 13. *Участок расположен в охранной зоне электрических сетей напряжением до 1000 вольт на площади 0,0521 га.*

Объект недвижимости **№ 11** – расположен на земельном участке с кадастровым номером **625684200009000012** *(право аренды по 16.02.2073, площадь 0,1139 га)* по адресу: Минская обл., Узденский р-н, Узденский с/с, 21. *Земельный участок имеет ограничения в использовании в связи с расположением в зоне санитарной охраны источников питьевого водоснабжения на площади 0,1139 га).*

Объекты недвижимости **№№ 12, 13** расположены на земельном участке с кадастровым номером **625684200009000011** *(право аренды по 16.02.2073, площадь 0,4306 га)* по адресу: Минская обл., Узденский р-н, Узденский с/с, 20. *Земельный участок имеет ограничения в использовании в связи с расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (в зоне санитарной охраны источников питьевого водоснабжения) на площади 0,4306 га, в охранной зоне электрических сетей напряжением до 1000 вольт на площади 0,0320 га, в придорожной полосе (контролируемой зоне) автомобильной дороги на площади 0,4306 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) – **2 606 784,00 бел. руб**.

Задаток 10 % от начальной цены – **260 678,00 бел. руб.**

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 13.12.2023 г.

Аукцион состоится **27.02.2024** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **26.02.2024** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320**.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, телефоны для осмотра: 8029-151-05-97, 8029-760-17-14, 8017-18-55-025.

УНП 690319084

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Галоўны дзяржсанурач Аляксандр ТАРАСЕНКА:

«СІТУАЦЫЯ З АДРОМ У БЕЛАРУСІ КАНТРАЛЮЕЦЦА»

Выпадкі захворвання на адзёр рэгіструюцца ў розных абласцях Беларусі. На сёння ў краіне іх выяўлена 204. Больш за ўсё — у Брэсцкай вобласці. 43 % хворых — дзеці ад 7 да 17 гадоў, і 30 % — людзі ад 18 да 40 гадоў.

На мінулым тыдні лабараторна пацверджаны выпадак адру быў зарэгістраваны ў Лідзе. Захворванне западозрана яшчэ ў 15 чалавек.

— Сітуацыя з адром у Беларусі кантралюецца, аднак насцярожанасць павінна быць. Калі казаць пра Ліду, то там толькі адзін хворы, які прыехаў у раён з суседняй вобласці. Паколькі ён кантактаваў з 15 чалавекамі, то зараз усе яны зарэгістраваны як кантакты з хворым, — пракаментаваў намеснік міністра аховы здароўя — галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Аляксандр Тарасенка. — У сувязі з тым, што захворванне вельмі кантагіёзнае, усе пацыенты з падазрэннем на адзёр шпіталізаваны ў інфекцыйнае аддзяленне раённай бальніцы. Гэта сведчыць аб тым, што насцярожанасць павінна быць яшчэ і з улікам таго, што цяпер адзначаецца рост захваральнасці вострымі рэспіраторнымі інфекцыямі ў Беларусі.

Больш за ўсё выпадкаў інфекцыі зарэгістравана ў Брэсцкай вобласці — 62 працэнты, на другім месцы (16 працэнтаў) — Магілёўская вобласць, на трэцім — Гродзенская. Як адзначыў галоўны дзяржсанурач, у Брэсцкай вобласці сітуацыя па адру звязана ў тым ліку з рэлігійнымі абшчынамі. Гаворка ідзе пра заўзятых адмоўнікаў ад вакцынацыі.

Шок-кантэнт для валасоў

Ці бываюць для іх бяспечныя фарбы?

Нягледзячы на старанні вытворцаў, формула зусім бяспечнай фарбы пакуль не знойдзена. Частае афарбоўванне ўсё яшчэ прычыняе шкоду валасам, робіць іх сухімі, ломкімі і цьмянымі. Але ва ўсе часы жанчыны фарбаваліся і будуць фарбавацца...

— Фарбуючы валасы, мы ўвесь час падвяргаем іх і скуру галавы ўздзеянню хімічных рэчываў — тытану, цырконію, бензалконію, вісмуту, барыю, стронцыю, алюмінію, волава, хрому, не кажучы аб такіх таксічных прымесях, як бензол, поліхлараваныя біфенілы і азафарбавальнікі. Фарба псуе не толькі самі валасы, але і ўплывае на іх фалікулы такім чынам, што нават зноў адрастаючыя валасы ўжо не будуць здаровымі і густымі. Скура галавы таксама раздражняецца, з'яўляюцца дэрматыты, сверб і перхаць, узнікаюць алергічныя рэакцыі, — расказвае **Святлана КЛІМУК, урач-лабарант Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя.**

Устойлівыя (перманентныя) саставы ўтрымліваюць аміяк, які дазваляе фарбавальным пігментам пранікаць унутр воласа за кошт прыадкрывання і аддзялення лускавінак. Валасы становяцца сухімі, порыстымі, ломкімі і кволымі, у іх разбураецца прыродны пігмент.

Паўперманентныя фарбы не ўтрымліваюць аміяку, але іх эфект менш устойлівы і даводзіцца падфарбоўвацца часцей, што не дадае здароўя вашым валасам. Адценкавыя шампуні і бальзамы — гэта найбольш бяспечны спосаб афарбоўкі пасля натуральных фарбавальнікаў — імі смела можна карыстацца.

Калі вы ўсё ж хочаце ці проста вымушаны афарбоўваць валасы, існуе некалькі правілаў:

• Выбірайце фарбу натуральнага паходжання (хна, басма, рамонак, куркума, карыца, хмель, кава, цыбульная шалупіна, мёд) або адценкавыя сродкі.

• Не мыйце валасы перад афарбоўкай — натуральная тлушчавая змазка абароніць валасы і скуру галавы ад пранікнення хімічных рэчываў і пашкоджання структуры.

• За некалькі дзён да афарбоўкі ўстойлівымі ці паўперманентнымі фарбамі правядзіце ўмацавальныя працэдуры для валасоў, маскі, масаж і тэст на адчувальнасць да дадзенага прадукту.

• Строга прытрымлівайцеся ўказанняў у анатацыі да фарбы — выконвайце прапорцыі, выкарыстоўвайце пальчаткі, не трымайце фарбу на валасах даўжэй рэкамендаванага інструкцыяй часу — гэта прывядзе да выпадзення валасоў, а не да яркага колеру.

• Пасля афарбоўвання ўстойлівымі і паўперманентнымі фарбамі першыя тыдні не выкарыстоўвайце фен, прас і шчыпцы.

Кіруюць апетытам, трэніруюць імунітэт, сінтэзуюць вітаміны

Чым для нас карысныя нават шкодныя бактэрыі?

З 2007 года вучоныя працуюць над стварэннем карты рассялення бактэрый у арганізме чалавека. Для гэтага ў вялікай колькасці людзей былі ўзятыя мазкі з розных месцаў цела. Кішэчнік па колькасці і відавым складзе бактэрый, безумоўна, займае першае месца. Дарэчы, у органах, якія дагэтуль лічыліся стэрыльнымі, напрыклад лёгкія, гэтак жа былі выяўлены розныя мікраарганізмы. Усе прадстаўнікі мікрафлоры кішэчніка ў суме важаць да 2 кг, і колькасць мікраарганізмаў складае каля 1000 мільярдаў.

Як бактэрыі здольныя ўплываць на наш апетыт, і як яны пасылаюць адпаведныя сігналы ў галаўны мозг? Як дысбаланс мікрафлоры можа прыводзіць да лішніх кілаграмаў? Ці трэба імкнуцца да татальнай чысціні ў жытле? Чым для нас карысныя нават дрэнныя бактэрыі? Які ўрон мы наносім арганізму, бескантрольна прымаючы антыбіётыкі, і ў якіх выпадках не трэба гэтага рабіць, расказала ўрач-інфекцыяніст 22-й гарадской дзіцячай паліклінікі Мінска Дар'я ПЕТРАЧУК.

— Дар'я Ігараўна, у нашай свядомасці ўкаранілася меркаванне, што большасць бактэрый небяспечныя для нашага арганізма...

— Насамрэч, большасць бактэрый не толькі бяскрыўдныя для нас, але і карысныя. Так, вядома, што супольнасці мікраарганізмаў у кішэчніку расшчапляюць неперавараныя рэшткі ежы, каб забяспечваць наш арганізм энергіяй, сінтэзуюць вітаміны, нейтралізуюць яды і рэшткі медыкаментаў, трэніруюць нашу імунную сістэму. Розныя бактэрыі сінтэзуюць розныя рэчывы, такія як кіслоты, газы, тлушчы, вітаміны. Цяпер ужо відавочна, што карысць ці шкода асобных прадуктаў харчавання таксама залежыць ад асаблівасцяў кішэчнай мікрабіёты. Напрыклад, у соевых прадуктах змяшчаецца рэчыва, якое асобныя кішэчныя бактэрыі ператвараюць у злучэнне, што спрыяе прафілактыцы астэапарозу, раку прастаты, сардэчна-сасудзістых і шэрагу іншых захворванняў.

Ёсць звесткі аб тым, што кішэчная мікрабіёта ўдзельнічае ў біятрансфармацыі лекаў, павышаючы ці, наадварот, зніжаючы іх эфектыўнасць. Таму ў хуткім часе пры вывучэнні і мадэляванні новых лекавых прэпаратаў давядзецца ўлічваць асаблівасці кішэчнай мікрабіёты.

Няправільны лад жыцця, нездаровае харчаванне, лекавыя прэпараты і стрэс могуць істотна прыгнятаць жыццядзейнасць карыснай мікрафлоры. З цягам часу гэта становіцца прычынай размнажэння патагенных мікраарганізмаў, узнікнення хранічнага запалення кішэчніка і іншых праблем са здароўем. Дысбаланс мікрафлоры можа прыводзіць да лішніх кілаграмаў.

Яшчэ навукоўцы гавораць аб тым, што бактэрыі здольныя кіраваць апетытам чалавека. Прасцей кажучы, атакі голаду ў 22:00, якія суправаджаюцца паяданнем шакаладу і цукерак, фарміруюцца не ў галаўным мозгу, а ў жываце, і напрамую за гэта адказвае супольнасць бактэрый. Самае дзіўнае, што мы ніяк не можам супрацьстаяць ім. У бактэрый гіпатэтычна ёсць сродкі і шляхі, каб уздзейнічаць на фарміраванне апетыту, на хуткасць пачуцця насычэння. Такім чынам, што і ў якой колькасці мы ядзім — гэта пытанне на ўзроўні свету бактэрый.

Каб з'явілася жаданне нешта з'есці, трэба, каб сігнал прыйшоў з мозгу. Бактэрыі здольныя сінтэзаваць кампаненты, якія праз абалонку сасудаў пранікаюць унутр галаўнога мозгу. Напрыклад, тыразін ці трыптафан. Абедзве амінакіслаты

ў галаўным мозгу ператвараюцца ў дапамін і сератанін. Усе, напэўна, чулі пра цэнтр заахвочвання ў галаўным мозгу. Усе нашы задавальненні незалежна ад прычыны іх паходжання суправаджаюцца выкідам дапаміну. Сератанін большасці вядомы як гармон шчасця. Тэорыя гаворыць: нашы бактэрыі нас заахвочваюць, калі яны задаволены ежай, якую мы ім пастаўляем. Гэта фарміруе ў нас прыемныя адчуванні. Бактэрыі, атрымаўшы пэўную ежу, уплываюць на ўзнікненне пачуцця насычэння. У шматлікіх даследаваннях было выяўлена, што сінтэз сігнальных рэчываў, якія адказваюць за насычэнне, адбываецца значна хутчэй, калі мы ядзім тое, што падабаецца нам і нашым бактэрыям.

— Але бактэрыі не толькі ўнутры нас, але і звонку. Ці трэба імкнуцца да татальнай чысціні ў доме?

— Пры панічным страху падчапіць якую-небудзь гадасць людзі імкнуцца ўсё вымыць і знішчыць. Такі від чысціні не зусім тое, што нам трэба. Чым стэрыльней кожнае індывідуальнае жытло, тым верагодней развіццё алергіі і аўтаімунных захворванняў у рамках сям'і. 30 гадоў таму алергія на той ці іншы алерген рэгістравалася ў кожнага дзясятага, сёння — у кожнага трэцяга. Але частата інфекцый не знізілася. Вынікі даследаванняў даюць аснову для новых уяўленняў аб чысціні. Пры гэтым размова не ідзе аб знішчэнні ўсяго небяспечнага. Больш за 95 % бактэрый нашай планеты не ўяўляюць для чалавека ніякай небяспекі. Больш за тое, многія з іх нам нават дапамагаюць.

Мэта ўборкі — знізіць колькасць бактэрый, якія жывуць у памяшканні, а не цалкам іх знішчыць. Бо і дрэнныя бактэрыі з'яўляюцца добрымі трэнерамі нашага імунітэту. Для кантролю працэсу размнажэння бактэрый існуюць чатыры даступныя кожнаму рычагі: разбаўленне, высокая тэмпература, асушэнне і ачыстка.

Разбаўленне ў хатніх умовах — гэта мыццё гародніны і садавіны. Канцэнтрацыя большасці бактэрый на іх паверхні пры гэтым становіцца настолькі мінімальнай, што яны перастаюць уяўляць наогул якую-небудзь небяспеку. Пры мыцці сталовых прыбораў, апрацоўчых дошак і посуду з дапамогай губкі дасягаецца такі ж эфект, але губка для посуду пастаянна вільготная, цёплая і поўная рэшткаў ежы — гэта ідэальнае асяроддзе для размнажэння бактэрый. Губка для мыцця посуду — адна з самых брудных рэчаў у доме. Яна бруднейшая ў 200 тысяч разоў у параўнанні з сядзеннем унітаза і можа выклікаць небяспечныя захворванні. Таму яе неабходна добра прамываць, выціскаць, прасушваць і часта мяняць.

На сухіх паверхнях бактэрыі не здольныя да размнажэння, многія нават гінуць, таму вымытая і працёртая падлога — самая чыстая. Асушэнне — цудоўная знаходка для барацьбы з бактэрыямі. Калі прадукты сухія, яны лепш і даўжэй захоўваюцца (макароны, мюслі, сухафрукты).

Большасць небяспечных для нас бактэрый не любіць высокай тэмпературы, таму пры гатаванні ежы трэба старанна прасмажваць ці праварваць мяса, птушку, яйкі, марскія прадукты. Даводзьце такія стравы, як супы і смажаніна, да кіпення, каб быць упэўненымі, што яны дасягнулі 70 °С, а таксама старанна падагравайце стравы, якія гатаваліся раней. Пры гатаванні мяса ці птушкі іх сокі павінны быць празрыстымі, а не ружовымі. Калі вы мыеце рэчы хворага, пажадана рабіць гэта пры тэмпературы не ніжэй за 60 °С.

Наша скура здольная ўтвараць уласную тлушчавую абалонку, і, каб яе змыць, дастаткова вады без мыла. Пры частым поўным змыванні тлушчавай абалонкі са скуры мы робім яе абсалютна безабароннай перад уздзеяннем навакольнага асяроддзя.

Таму памятайце, што чысціня — гэта разумны баланс вялікай колькасці добрых бактэрый і невялікай колькасці дрэнных.

— Як быць пры прыёме антыбіётыкаў? Мы ж знішчаем і шкодныя, і карысныя бактэрыі...

— Антыбіётык выконвае тры задачы: атручванне бактэрый, прыгнятчэнне здольнасці да размнажэння і разбурэнне бактэрыі. Уздзейнічаць такім жа спосабам на вірусы антыбіётык не ў стане. Пры бескантрольным іх прыёме мы знішчаем частку карысных бактэрый, наносячы тым самым каласальны ўрон мікрафлоры. З асаблівай асцярожнасцю трэба ставіцца да антыбіётыкаў у малых, мікрафлора дзіцяці сама па сабе нестабільная і аднаўляецца значна даўжэй па заканчэнні лячэння.

З кожным годам бактэрыі вучацца адаптавацца да антыбіётыкаў і хуткасць адаптацыі ўсё ўзрастае. Па даных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, праз некалькі дзясяткаў гадоў антыбіётыкі стануць бескарысным відам лекаў. Той, хто жадае абараніць свой кішэчнік ад бессэнсоўных войн з удзелам антыбіётыкаў, павінен прытрымлівацца некалькіх правіл. Не прымаць антыбіётыкі без сур'ёзных паказанняў, якія вызначае ўрач, у асноўным, гэта такія захворванні, як запаленне лёгкіх, ангіна, гнойны атыт, піяланефрыт, гаймарыт. Важна прытрымлівацца часу прыёму. Не варта спыняць прыём антыбіётыкаў у той момант, калі вам стала лепей.

Купляць мяса і птушку, а таксама астатнія прадукты трэба ў праверaных прадаўцоў або ў крамах. А лепш з маркіроўкай «бія», гэта адзначае адсутнасць антыбіётыкаў у корме жывёл з мэтай павелічэння пагалоўя. Выбірайце гародніну і садавіну лепш свайго рэгіёна, бо яны не падвяргаюцца хімічнай апрацоўцы для далёкай транспарціроўкі.

Наносячы ўдар па бактэрыях антыбіётыкамі, мы атрымліваем у адказ удар у выглядзе развіцця небяспечнай для арганізма ўстойлівасці. Навукоўцы ж прымаюць гэты выклік і прыступаюць да распрацовак новых антыбіётыкаў. Кожны з нас уключаецца ў гэты працэс, як толькі праглынае таблетку. Мы бярэм у заложнікі нашы добрыя бактэрыі ў надзеі перамагчы дрэнныя. Важна разумець, што пры нязначнай прастудзе гэта пройгрышны ход, у выпадку сур'ёзнага захворвання — вартая таго здзелка.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «БЕЛХИМ», Минская обл., Дзержинский р-н, Фанипольский с/с, 19
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: **www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов: оборудование, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 22

№ лота	Наименование	Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.
1	**Полуавтоматическая флексографская печатная просекательно-рилевочная машина. Модель BYKM-II 1200*1200, инв. номер 515Т**	**37 680,00** (снижена на 60 %)
2	**Полуавтоматическая флексографская печатная просекательно-рилевочная машина. Модель YKS-1225, инв. номер 323Т**	**58 680,00** (снижена на 40 %)

Задаток 10 % от начальной цены в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 30 календарных дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов: 100 % оплата стоимости в течение 10 календарных дней после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by.

Ответственность участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **4 %** от цены продажи предмета аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 03.10.2023 г.

Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 13.00 16.02.2024.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок

Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 15.02.2024 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные данные	**Тел.: +375 17 310-36-37; 8029-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

ИНФОРМАЦИОННОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

